ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 59 (2008)
23 ЛІПЕНЯ 1965 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Сустрэча ўдзельнікаў Міжнароднага кінафестывалю — прадстаўнікоў ГДР і В'етнама на вакзале ў Мінску.

Фота Ул. КРУКА.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

Дарогамі БАЦЬКОЎСКАЙ СЛАВЫ

Карэспандэнту ЛІМа адказвае першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. ЖАБІЦКІ

ВАСКОВЫЯ сосны і кучомістыя дубы, бялявыя бярозы і палахлівыя асіны... Бруістыя рэкі, крыштальныя крыніцы, задумённыя азёры... Гэта край дарагі наш, Беларусь. Край легенд і казак, край былін і паданняў. Далёка не ўсе яны сабраны ды запісаны.

Яшчэ вельмі шмат незапоўненых старонак і ў аб'ёмістым летапісе Вялікай Айчыннай вайны. Не ўсе яшчэ імёны герояў запісаны золатам на мармуры, не ўсім яшчэ героям пастаўлены помнікі і абеліскі, нарэшце, яшчэ не ўсе іх магілы ведаюць людзі.

Мы і нашчадкі нашы павінны ведаць, памятаць тых, хто аддаў сваё жыццё, каб чорныя хмары ніколі не засцілі сонца, каб буялі кветкі, звінелі дзіцячыя галасы, цвілі ўсмешкі.

Пошукі загінуўшых герояў, сустрэчы з былымі франтавікамі працягваюцца. Сёлета, у 20-ю гадавіну вялікай Перамогі, ЦК ВЛКСМ прыняў рашэнне правесці Усесаюзны турысцкі паход камсамольцаў і моладзі па шляхах баявой славы бацькоў.

«Мы клічам цябе, малады рабочы, студэнт, юны следапыт, — гаворыцца ў гэтым рашэнні, — у час летняга адпачынку ці канікул, у нядзелю ці святочны дзень пайсці ў турысцкі паход па дарогах вайны, на пошукі новых яшчэ герояў, на сустрэчу з учарашнімі салдатамі, з тымі, хто сёння па-гвардзейску працуе на франтах камуністычнага будаўніцтва».

Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» С. Блатун папрасіў першага сакратара ЦК ЛКСМБ Генадзя Мікалаевіча Жабіцкага расказаць, як праходзіць гэты турысцкі паход у нашай рэспубліцы.

— Чым адрозніваюцца сёлетнія турысцкія паходы ад ранейшых?

— Летась, — гаворыць Генадзь Мікалаевіч, — праводзілася шмат турысцкіх паходаў у гонар 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Маршруты таксама праходзілі па месцах баявой славы бацькоў. Магчыма, памятаеце, што тады пасланцы шматтысячнай арміі беларускіх калумбаў сабраліся на рэспубліканскі злёт каля помніка загінуўшым героям ля легендарнага возера Нарачы. Тут яны ўстанавілі мемарыяльную дошку і пасадзілі парк Славы — жывы помнік бацькам і братам, якія аддалі сваё жыццё за Радзіму.

Сёлета ж дарога паклікала яшчэ больш рамантыкаў і следапытаў. Ужо адбыўся рэспубліканскі злёт турыстаў. Ён быў праведзены ля помніка адважнаму сокалу Мікалаю Гастэлу. У госці да турыстаў прыехаў сын героя Віктар Мікалаевіч.

У параўнанні з мінулым годам распрацавана куды больш цікавых турысцкіх маршрутаў. У паходах юнакі і дзяўчаты збіраюць матэрыялы пра воінаў Савецкай Арміі, якія змагаліся з ворагам на нашай зямлі, пра адважных беларускіх партызан, падпольшчыкаў, пішуць гісторыю іх подзвігаў, ствараюць музеі і куткі баявой славы, прыводзяць у парадак магілы герояў і партызанскія зямлянкі.

ЦК ЛКСМБ і Міністэрства асветы БССР аб'явілі шостую рэспубліканскую экспедыцыю «Па слядах герояў». У паходы адправілася амаль 24 тысячы экспедыцыйна-турысцкіх атрадаў, гэта — каля 356 тысяч школьнікаў.

Па дарогах баявой славы хадзілі ўжо ў паходы студэнты мінскіх інстытутаў — політэхнічнага і радыётэхнічнага, універсітэта, рабочыя Аршанскага льнокамбіната, Полацкага завода шкловалакна, віцебскай фабрыкі «КІМ»... Ды хіба ўсіх пералічыш!

— Генадзь Мікалаевіч, колькі людзей зараз у арміі турыстаў Беларусі!

— Дакладную лічбу нават і не назавеш. Многія тысячы... Толькі ў сістэме прафсаюзаў працуе сёння больш як дзве з палавінай тысячы турысцкіх секцый. Прывяду такі характэрны прыклад. Сёлета толькі ў чэрвені ў Брэсцкай вобласці пабывала ў падарожжах столькі турыстаў, колькі за ўвесь мінулы год.

Дзякуючы пошукам турыстаў, следапытаў у калгасах і саўгасах рэспублікі створана 1500 музеяў і куткоў, каля 100 клубаў баявой славы. Безумоўна, што пасля сёлетніх паходаў яны папоўняцца новымі цікавымі матэрыяламі.

— Назавіце, калі ласка, некалькі імёнаў герояў, якія сталі вядомымі, дзякуючы пошукам турыстаў.

— О, іх таксама вельмі шмат... Так, у час вайны жыхары вёскі Дымава, што на Віцебшчыне, бачылі, як савецкі ястрабок завёў бой з цэлай эскадрыллёй фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў і збіў двух з іх. Але і сам загінуў у няроўным баі. Доўга ніхто не ведаў нічога пра героя-лётчыка. І толькі нядаўна турысты віцебскага добраахвотнага спартыўнага таварыства «Спартак» дазналіся, што гэта быў падпалкоўнік І. Самахвалаў.

Юныя следапыты Целяханскай школы-інтэрната сабралі і збіраюць цікавыя звесткі аб партызанах атрада, які ўзначальваў Аляксей Чарткоў, ствараюць музей гэтага атрада. Навучэнцы Клічаўскай сярэдняй школы вядуць пошукі ўдзельнікаў падпольнай камсамольскай арганізацыі, якая дзейнічала на тэрыторыі раёна. Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

— Хто кіруе турысцкімі паходамі?

— Сёлета створаны рэспубліканскі штаб па кіраўніцтву і правядзенню паходаў камсамольцаў і моладзі па дарогах баявой славы бацькоў. У саставу штаба-цэнтра ўваходзяць ветэраны вайны, Героі Савецкага Саюза, адказныя камсамольскія, спартыўныя работнікі, работнікі ДТСААФ і ваенных камісарыятаў. У паходы турысты адпраўляюцца і пешшу, і па вадзе, і на веласіпедах, матацыклах, спадарожных машынах. Узначальваюць іх, як правіла, ветэраны вайны, вопытныя інструктары па турызму, а кіруюць паходамі штабы пры абласных і раённых камітэтах камсамола. Напрыклад, юных следапытаў Мікрапольскай школы Віцебскага раёна павёў па месцах баявых дзеянняў партызанскай брыгады бацькі Міная былы партызан тав. Старыковіч.

— Якія ўзнагароды чакаюць пераможцаў?

— Вынікі рэспубліканскага паходу школьнікаў будуць падведзены ў жніўні, а турыстаў — рабочых, студэнтаў — у верасні. Рэспубліканскі савет па турызму і камітэт ДТСААФ рыхтуе каштоўныя прызы і падарункі за лепшыя справаздачы аб паходзе, лепшы аматарскі фільм, турысцкі дзённік і г. д. Але, бадай, самай высокай узнагародай для кожнага падарожніка будзе пуцёўка на Усесаюзны злёт турыстаў, які адбудзецца ў верасні ў Брэсце ля сцен легендарнай цытадэлі.

У гэтыя дні Брэсцкі абком камсамола, Музей Брэсцкай крэпасці старанна рыхтуюцца да сустрэчы пасланцоў шматмільённай арміі турыстаў нашай краіны. Свяшчэнная зямля, дзе змагаліся за свабоду нашы бацькі і браты. На магілах герояў, ля помнікаў не вянуць кветкі, шумяць зялёным лісцем дрэвы. Сюды прыйдуць сыны і дочкі, каб аддаць героям свой зямны паклон.

— Скажыце, калі ласка, некалькі слоў у адрас літаратараў, творчых работнікаў рэспублікі.

— Перш за ўсё, я хачу сказаць пра вашу газету. У свой час яна заслужыла пахвалу са старонак «Праўды» за тое, што павяла размову аб увекавечанні героікі Вялікай Айчыннай вайны. Калі не памыляюся, рубрыка была ў вас такая — «Не забудзем мы—не забудуць нашчадкі». Я мяркую, што артыкулы пра герояў трэба часцей друкаваць і цяпер. А для літаратараў, творчых работнікаў тэма Вялікай Айчыннай вайны — невычэрпная. Застаецца пажадаць ім толькі добрага плёну ў гэтай удзячнай рабоце.

ФІЛЬМЫ-ПЕРАМОЖЦЫ

Вынікі IV Міжнароднага кінафестывалю ў Маскве

ЧАЦВЁРТЫ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ 1965 МАСКВА

РАШЭННЕ ЖУРЫ ПА ПОЎНАМЕТРАЖНЫХ МАСТАЦКІХ ФІЛЬМАХ

Вялікі прыз — фільму **«Вайна і мір»** (СССР).
Вялікі прыз — фільму **«20 гадзін»** (Венгрыя).

Залаты прыз — фільму **«Неба над галавою»** (Францыя).

Залаты прыз — фільму **«Замах»** (Чэхаславакія).

Спецыяльны залаты прыз журы — рэжысёру Валерыо Дзурліні за фільм **«Яны ішлі за салдатамі»** (Італія).

Сярэбраны прыз — фільму **«Тры крокі па зямлі»** (Польшча).

Сярэбраны прыз — фільму **«Вялікія гонкі»** (ЗША) за лепшую кінакамедыю.

Прыз фестывалю — фільму **«Такі малады свет»** (Алжыр) за лепшы фільм нацыянальнай кінематаграфіі, якая развіваецца.

Прыз фестывалю — актрысе **Сафі Лорэн** (Італія) за лепшае выкананне жаночай ролі.

Прыз фестывалю — акцёру **Сярго Закарыядзе** (СССР) за лепшае выкананне мужчынскай ролі.

Прыз фестывалю — рэжысёру **Іону Папескі-Гопа** (Румынія) за арыгінальную рэжысуру фільма-казкі.

Прыз фестывалю — фільму **«Прыгоды Вернера Хольта»** (ГДР), за экранізацыю антыфашысцкага рамана Дзітэра Ноля.

Прыз фестывалю — аператару Томіславу Пінцеру (Югаславія) за фільм **«Праметэй з вострава Вішавіцэ»**.

Прыз фестывалю — фільму **«Дазвол на шлюб»** (Балгарыя) за лепшы фільм пра моладзь.

Спецыяльны дыплом журы — рэжысёру Сусуму Хані (Японія) за выдатную работу з дзецьмі ў фільме **«Поплеч»**.

Спецыяльны дыплом журы — рэжысёру фільма **«Праметэй з вострава Вішавіцэ»** (Югаславія) Ватрославу Міміца.

Спецыяльны дыплом журы — фільму **«4×4»** (Нарвегія) за дацкую і шведскую навелы.

Спецыяльны дыплом журы — акцёру **Бурвілю** (Францыя) за лепшае выкананне камедыйнай ролі.

Дыплом журы — актрысе **Людміле Савельевай** (СССР) за выкананне ролі Наташы ў фільме **«Вайна і мір»**.

Дыплом журы — актрысе **Джулі Крысці** (Вялікабрытанія) за выкананне ролі Дыяны ў фільме **«Дарагая»**.

РАШЭННЕ ЖУРЫ ПА КАРОТКАМЕТРАЖНЫХ ФІЛЬМАХ

Залаты прыз — фільму **«Сляза на твары»** (Югаславія).

Залаты прыз — фільму **«Двое»** (СССР).

Сярэбраны прыз — фільму **«60 кругоў»** (Канада).

Сярэбраны прыз — фільму **«Нгуен Ван Чой вечна жывы»** (ДРВ).

Сярэбраны прыз — фільму **«Пастухі з Каута»** (Куба).

Прыз фестывалю — фільму **«Агляд на месцы»** (Польшча).

Прыз фестывалю — фільму **«Месяц добрага сонца»** (СССР).

ПРЫЗЫ І ДЫПЛОМЫ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

ФІПРЭСІ (Міжнародная федэрацыя кінапрэсы) — фільмам **«20 гадзін»** (Венгрыя) і **«Двое»** (СССР). УНІАТЭК (Міжнародная арганізацыя кінатэхнікі) за лепшае выкарыстанне дасягненняў кінатэхнікі фільму **«Вялікія гонкі»** (ЗША). Спецыяльны прыз Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР — фільму **«Малады салдат»** (ДРВ). Прыз Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР — фільму **«Чырвоная барада»** (Японія). Прыз Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР — фільму **«Кат»** (Іспанія). Дыплом Аргкамітэта фестывалю — фільму **«Адзін дзень у маім дварэ»** (Куба). Дыплом Аргкамітэта фестывалю — фільму **«Рынак кветак»** (Аргенціна). Дыплом Аргкамітэта фестывалю — фільму **«І мы разумеем адзін аднаго»** (ГДР). Прызы Савецкага камітэта абароны міру: Вялікі прыз — фільму **«Прыгоды Вернера Хольта»** (ГДР), прыз — фільму **«Здраднік»** (Грэцыя), дыплом — фільму **«Трэці тыдзень моладзі»** (Малі). Прыз Саюза таварыстваў дружбы — фільму **«Мой дом — Капакабана»** (Швецыя). Прыз Камітэта салідарнасці краін Азіі і Афрыкі — фільму **«Паўднёвы В'етнам змагаецца»** (Народны фронт вызвалення Паўднёвага В'етнама). Прыз Саюза журналістаў — фільму **«БІД-65»** (ГДР). Прыз Саюза спартыўных арганізацый — фільму **«Вялікая алімпіяда»** (Японія). Прыз Камітэта маладзёжных арганізацый — фільму **«Малады салдат»** (ДРВ). Прызы часопіса «Искусство кино» — пісьменніку **Уга Піра** (Італія), фільму **«Дружба дружбай»** (МНР). Прыз часопіса «Советский экран» — актрысе **Людміле Савельевай** (СССР). Прыз «Інтурыста» — фільму **«Грэцыя без руін»** (Грэцыя). Прыз Міністэрства грамадзянскай авіяцыі — рэжысёру **Іву Чампі** (Францыя).

Фестываль — госць Мінска

У гэтыя дні чацвёрты Міжнародны кінафестываль, які праходзіў пад дэвізам «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі», перамясціўся з Масквы ў іншыя гарады нашай краіны.

Эмблема кінафестывалю — кінаэкран на фоне зямнога шара — відаецца сёння на ўсіх вуліцах Мінска.

Учора ў кінатэатрах «Перамога», «Мір» і ў клубе імя Дзяржынскага пачаўся паказ фільмаў Маскоўскага фестывалю.

Беларускія гледачы пазнаёмяцца з чатырма конкурснымі кінафільмамі. Адзін з іх — «Прыгоды Вернера Хольта» — удастоіўся на Маскоўскім фестывалі прыза за экранізацыю антыфашысцкага рамана. Раман Дзітэра Ноля пад гэтай жа назваю шырока вядомы ў нашай краіне. «Чэрава, якое нарадзіла зло, яшчэ пладавітае» — іменна гэтай думкаю кіраваўся рэжысёр ГДР Іоахім Кунерт, калі пачынаў здымаць свой фільм. Яшчэ да гэтай пары жыве дух мілітарызму ў Заходняй Германіі, яшчэ да гэтай пары былая вайна ўслаўляецца як каскад фашысцкага патрыятызму. Гэты фільм — не толькі напамін пра бясслаўнае мінулае. Гэта псіхалагічнае даследаванне юнай натуры, абалваненай фашысцкай прапагандай, здаровы дух якой пратэстуе супраць гібелі не толькі сваёй, але і іншых, такіх маладых і ашуканых. «Прыгоды Вернера Хольта» — адзін з самых моцных кінатвораў пра вайну, якія дэманстраваліся на фестывалі ў Маскве.

Французская кінематаграфія прадстаўлена ў Мінску драмай «Месье» з папулярнейшым акцёрам старэйшага пакалення Жанам Габэнам.

Польскае кіно на Маскоўскім кінафестывалі яшчэ раз прадэманстравала сваё высокае майстэрства. Фільм «Тры крокі па зямлі» ўзнагароджан Сярэбраным прызам. Беларускія гледачы пазнаёмяцца з другім фільмам фестывалю — «Першы дзень свабоды». Аляксандра Форда. Выхад гэтай карціны ў Польшчы з'явіўся буйнай падзеяй. Фільм атрымаў ужо дзве ўзнагароды: «Залатую качку» — прыз кінагледачоў і «Варшаўскую сірэну» — прыз кінакрытыкі. Фільмы Аляксандра Форда вядомыя ў нас даўно, сярод іх былі «Юнацтва Шапэна», «Пяцёра з вуліцы Барскай», «Крыжаносцы».

«Першы дзень свабоды» — экранізацыя п'есы Ляона Кручкоўскага, пастаўленай у многіх савецкіх тэатрах. Асоба чалавека, пакалечанага вайною, паўстае ў гэтым маштабным двухсерыйным фільме ва ўсёй сваёй трагічнасці і складанасці. Здымаліся ў фільме знаёмыя нам акцёры: Беата Тышкевіч, Эльжбета Чыжэўска, Тадэуш Ламніцкі.

Тадэуш Ламніцкі — госць кінафестывалю ў Мінску, і гледачоў чакаюць сустрэчы з гэтым вядомым акцёрам.

Англійскі фільм «Мост праз раку Квай» паказваўся на Маскоўскім кінафестывалі па-за конкурсам. Творчасць рэжысёра Дэвід Ліна, стваральніка гэтага фільма, знаёма нам па карцінах «Вялікія надзеі» і «Олівер Твіст». Галоўную ролю ў фільме «Мост праз раку Квай» выконвае адзін з буйнейшых англійскіх акцёраў Алек Гінес.

Учора беларускія кінематаграфісты сустракалі сваіх калег з В'етнама, Польшчы і ГДР.

Самая шматлікая сярод гасцей Мінска — в'етнамская дэлегацыя: кіраўнік дэлегацыі Хо Ван Лай, маладая актрыса Мінь Дык (фільм з яе ўдзелам «Малады салдат» ішоў на Маскоўскім фестывалі і атрымаў два прызы савецкіх грамадскіх арганізацый), кінакрытык Ле Хыу Тхой, культташэ Ву Тоан.

Перад праглядам фільмаў, якія дэманстраваліся на конкурсных экранах Масквы, гледачы Мінска сустрэнуцца з рэдактарам кінастудыі ДЭФА Альбрэхтам, польскім кінаакцёрам Тадэушам Ламніцкім і іншымі гасцямі.

Праграма паказу фестывальных фільмаў у Мінску шырокая і разнастайная.

Чалавек і праблема

ГАРКОТА БЯРОЗАВАГА СОКУ

ЕГЕР КОПЕЛЕЎ

У малодшага егера Чэрыкаўскага заказніка Копелева худы, карычневы ад загару твар. Сам ён невысокага росту, у вылінялай салдацкай гімнасёрцы. Мы ляжым на вялікім лоўжы галля. У глыбіні лоўжа відаць бабрыная хатка: подсціл з леташняга лісця, гарошыны памёту і белы шкілет невялікай рыбіны. Цяпер бабры ў гняздзе не жывуць. Жывуць у норах на беразе. Тут яны ратаваліся ад паводкі.

Сонца праклюнула небасхіл і стаіць на ўзроўні вачэй. Здаецца, яно не рухаецца... Моцна пахне вярбовая кара. Гэта пах «бабрынага струменю». «Бабрыны струмень» — нібы компас бабра. Па ім ён знаходзіць дарогу ў сваё гняздо.

— Чуеце?

Прыслухоўваюся: тонкі, з усхліпваннем дзіцячы плач...

— Гэта малыя, — тлумачыць егер. — Уцяклі з хаткі, а назад патраліць не могуць, заблудзіліся. Нырацъ яны яшчэ таксама не ўмеюць, бачыце?

— Як паплаўкі?

— Цішэй... Глядзіце!

— Ніколі такіх не бачыў: чорны, як вугаль...

— Гэта чорны бабёр. Завезлі яго з Сібіры. Вельмі злосны. Шыпіць, калі чалавека ўбачыць. Норы любіць глыбокія... Бачыце — зубы ў яго ашчэраныя. Яны ўвесь час растуць. Таму бабёр ні мінуты не можа сядзець без работы — яму трэба зубы точваць. Зусім яшчэ малады...

— Як вы пра гэта даведаліся?

— Па зубах. Зубы ў яго вузкія яшчэ, як папяроскі.

— Рыбу ён таксама есць?

— Рыбы бабры не ядуць.

— Я чытаў дзесьці, здаецца...

— Лічылі так адзін час, таму што ў бабрыных гнёздах рыбу знаходзілі абгрызеную. А рыбу гэтую норка прыносіць. Яна любіць туляцца ў бабрыных гнёздах.

— Норка тут таксама ёсць?

— У пяцьдзесят сёмым завезлі. Спачатку не хацела ісці ў раку. Мы за імі, норкамі, значыць, з дубцамі ганяліся. Прыносілі жаб, рыбу — падкормлівалі. Цяпер іх многа. Летась восемдзесят норак адлавілі... Раней у нас быў толькі бабрыны заказнік, — расказваў егер. — Для бабра тут прастора. У нас самы ўкормлены бабёр ва ўсёй рэспубліцы.

Слізгаючы ботамі па мокрым галлі, мы спусціліся ўніз. Ручай выцякаў з возера і ўпадаў у невялікую рэчку Сенну. Прайшлі ўздоўж Сенны, да таго месца, дзе яна, амаль не пашыраючы рэчышча, упадае ў Сож. Ад берагоў Сожа адыходзілі штучныя гаці (каб плынь паглыбляла фарватэр). Егер кожны раз спыняўся, расхінаў кусты, паказваў на вытантаную траву, прыглядаўся да слядоў на гразі: тут ласі прабілі дарогу, гаварыў ён, а вось выдра піла, а тут зайцы хапалі бярозу... Я падумаў, што для гэтага чалавека, які жыве сярод звяроў, птушак, дрэў, ва ўсім гэтым была свая, асаблівая, непрыкметная з першага погляду радасць. Егер ведаў тут кожны куст, кожнага звера запомніў у «твар», і ў гэтым сэнсе для яго не было радасці пазнавання, здзіўлення перад невядомым. Яна была ў іншым: у тым, што ўсё ідзе так, як павінна быць. І звяры, і птушкі — усе яны знаходзіліся ў тых месцах, дзе ім трэба было знаходзіцца, кожны след пацвярджаў гэта, і ў гэтым пастаянстве прыроды была заслуга і шчасце гэтага чалавека...

Егер паказаў мне кармушку лася. Між буралому, амаль у непранікальным для сонечнага святла бары на дошчачцы ляжаў вялізны кавалак солі, абгрызены зверам.

— Такіх кармушак у мяне на ўчастку шмат.

— Соль як дастаўляеце?

— Іншы раз даюць падводу ў калгасе, а больш за ўсё на сабе. З транспартам у нас дрэнна. Ідзеш сюды па гразі, па снезе, дзе паўзком, дзе бягом, — егер засмяяўся. — Участак у мяне 28 тысяч гектараў — пакуль увесь абыдзеш! Браканьеру добра, ён на машыне. — пазайздросціў Копелеў. Потым нахмурыўся: — Учора злавіў браканьера. Касянкоў — вартаўнік з Пільна. Зацкаваў касулю сабакамі. Яшчэ пагражаў мне. Гаворыць: утопім цябе ў рацэ. А то дадому прыходзіць, жонку страшаць... А летась браканьеры зацкавалі цэлы вывадак касуль. Крыўдна, як падумаеш: людзі, а горшыя за ваўка. Той хоць для ежы, а гэтыя... Малыя ж зусім былі касулі, якое там мяса, адны вочы вялізныя... Якую пругажосць загубілі! — егер адкашляўся. — На нашым заказніку ўся вобласць трымаецца. План перавыконваем рэгулярна. А прайдзі ўбок — там хоць шаром пакаці. Варта звяру з заказніка выйсці, ён на відавоку. Нам, на маю думку, цяпер не аб плане трэба клапаціцца, а аб тым, каб звяра было ў вобласці больш. Вось мы адстрэльваем кожны год па некалькі ласёў, а прыросту амаль ніякага. Ад апалення палёў звер гіне, ад браканьераў. Выходзіць, працуеш, працуеш, і ўся твая праца марная...

— А вы даўно працуеце ў заказніку?

— Дзякуй богу, чатырнаццаць гадоў.

[Заканчэнне на 3-й стар.].

АРХІТЭКТУРА

МАСТАЦКІ ВОБРАЗ ГОРАДА

Георгій СЫСОЕЎ, архітэктар.

ГАРАДСКІ пейзаж дзейнічае на нашы пачуцці, выклікаючы цэлы комплекс уражанняў. Мы або захапляемся прыгажосцю гарадскіх ансамбляў, архітэктурай асобных будынкаў, плошчамі і помнікамі, яркай рэкламай, або застаемся раўнадушныя ці нават глыбока незадаволеныя. А жыллё, у якім жыве чалавек, хіба яно не нараджае ў яго радасці або смутку?

Творы архітэктуры могуць мець вялікую вобразную сілу, і, гэтак жа як жывапіс, літаратура і драматургія, уплываць на ідэйныя і эстэтычныя погляды чалавека. І таму, натуральна, ва ўсе часы развіцця цывілізацыі праблема выразнасці архітэктуры стаяла вельмі востра.

З ПЕРШЫХ ЖА ДЗЕН Савецкай дзяржавы наша архітэктура набыла асаблівыя функцыі, яна імкнулася задаволіць патрэбы новага часу.

Першыя два дзесяцігоддзі пасля Вялікага Кастрычніка мы шукалі новыя формы арганізацыі прасторы, новыя матэрыялы, канструкцыі. Надзвычай разнастайнае прызначэнне архітэктурных збудаванняў новага, сацыялістычнага грамадства патрабавала смелага эксперыментавання, адмаўлення ад застылых канонаў і ад голага утылітарызму.

Духам сучаснасці, наватарскімі прыёмамі кампазіцыі вылучаецца, напрыклад, Дом урада ў Мінску. Пабудаваны 30 гадоў назад на праекце І. Лангбарда, ён і сёння — адзін з лепшых адміністрацыйных будынкаў сталіцы рэспублікі, вылучаецца як зручнасцю планіровачнага вырашэння, так і выразнасцю архітэктурнага вобраза.

Аднак з цягам часу ў нашай архітэктуры зніклі смелы эксперымент і наватарскія пошукі. Мы пачалі капіраваць архітэктуру мінулага, імкнуліся зрабіць нашы праспекты падобнымі на Неўскі, а нашы дамы — на італьянскія палацы, грэчаскія храмы або дваранскія сядзібы. У Мінску, напрыклад, па такому ўзору быў пабудаваны Палац культуры прафсаюзаў. Аўтар яго, трапіўшы ў палон дагматычных прыёмаў кампазіцыі, перанёс у свой праект вобразы культавых збудаванняў далёкага мінулага. Альбо вось будынак галоўнага універмага ў Мінску. Нястрыманая дэкарацыя фасада, перагружанасць упрыгожваннямі яго інтэр'ераў пярэчаць асноўнаму прызначэнню будынка: рэкламе і продажу тавараў. Порцікі, каланада, іллюзорныя дэкаратыўныя балконы, вежы, шпілі надаюць дамам на Прывакзальнай плошчы і некаторым дамам на Ленінскім праспекце і Даўгабродскай вуліцы неарганічныя архітэктуры жылога дома рысы манументальнасці.

Аднак ці правільна будзе ганіць агулам ўсё, што створана ў тыя гады? Безумоўна, не. І пацверджанне гэтаму — новыя ансамблі Масквы і Ленінграда, Кіева і Новасібірска, Віцебска і Гомеля і многіх іншых гарадоў, даволі выразныя па вобразнаму ладу.

У нас у Мінску ў той час была створана першая чарга Ленінскага праспекта. Гэтая вуліца ад плошчы Леніна да плошчы Якуба Коласа вырашана як парадная магістраль. Уздоўж яе стаяць будынкі, прыгожыя па дэталях, выразныя па кампазіцыі: адміністрацыйны будынак на Камсамольскай вуліцы, банк, паштамт. У ярка-асветленых вітрынах першых паверхаў дамоў — выстаўкі тавараў і рэклама. Уздоўж тратуараў — рады ліп. І ўсё гэта робіць горад прыгожым.

Нядаўна мне давялося гаварыць з акцёрамі Тэатра імя Ленсавета. Ленінградцы назвалі Мінск горадам-прыгажуном. Яны пахвалілі і тую частку праспекта, пра якую мы гаворым.

Сёння многія ансамблі нашага горада ўжо не адпавядаюць сучасным архітэктурным патрабаванням. Сёння мы будуем інакш, наша архітэктура ідзе па новаму шляху. І ўсё ж створанае намі ў першыя пасляваенныя гады захоўвае сваю эстэтычную каштоўнасць. Новыя ансамблі, становячыся побач са старымі, у кантрасным спалучэнні з імі, яшчэ ярчэй падкрэсліваюць шматграннасць прыгожага.

ШТО Ж СТАНОВІЦЦА асновай выразнасці сучаснай архітэктуры?

Сёння ў нас яшчэ няма новых дасканалых архітэктурных комплексаў, пра якія хацелася б гаварыць, і таму разгледзім першыя крокі, зробленыя нашымі архітэктарамі.

Мы будуем цяпер не так, як дзесяць гадоў назад. Сённяшнія грамадскія будынкі, дзіцячыя сады, школы, жытло праектуюцца па прынцыпу лагічнасці, мэтазгоднасці. Строгасць форм, вытанчанасць прапорцый, максімальнае раскрыццё інтэр'ераў на прыроду, мноства святла ў памяшканнях — усё гэта надае новую вобразную выразнасць архітэктуры нашых дзён. Спашлюся на такія прыклады. Будынак Мінскага гарвыканкома на плошчы Леніна трапна ўпісваецца ў навакольную забудову як па маштабу, так і па архітэктурнай трактоўцы. Ён гарманіруе з Домам урада, у якога характэрнае для свайго часу аблічча, і Галоўным паштамтам — манументальным збудаваннем, выкананым у рэчышчы класічнай архітэктуры. Цікавы па кампазіцыйным прыёме і новы корпус інстытута замежных моў (архітэктары І. Есьман і Н. Шпігельман). Тут ужыты каркасная схема і навесныя панелі. Гэта дазволіла стварыць сучасны па аб'ёму будынак са стужкавым зашкленнем. Добра вырашаны пераход да старога будынка інстытута. Сучасна і строга выкананы інтэр'еры. Начярэдадні Першамая былі здадзены ў эксплуатацыю два палацы культуры — на трактарным заводзе (архітэктар Я. Бенядзіктаў) і камвольным камбінаце (архітэктар С. Мусінскі). Аўтары праектаў здолелі стварыць арыгінальныя ансамблі, якія ўжо сталі ўлюбёнымі месцамі адпачынку мінчанаў.

[Заканчэнне на 2-й стар.]



Так будзе выглядаць плошча на скрыжаванні вуліц Волгаградскай і Якуба Коласа. Некаторыя з дамоў, якія вы бачыце на малюнку, ужо будуюцца.

Малюнкі аўтара.

Не аб адным хлебе...

ЦАЛІНА, ЯКУЮ ТРЭБА ЎЗНІМАЦЬ

Іван КАПОЦЯ,
дырэктар Гомельскага абласнога Дома народнай творчасці

ВАЖНАЯ і своечасовая размова ідзе на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» пад рубрыкай «Не аб адным хлебе...» Мне спадабалася канферэнцыя ў калгасе «Першае мая» Слуцкага раёна, якая прайшла пад дэвізам: культура, быт, прыгажосць. На ёй было ўзнята важнае пытанне—аб кадрах культасветработнікаў для вёскі. Сапраўды, сёння гэта праблема нумар адзін. Ад яе паспяховага вырашэння залежыць вельмі многае.

Прыгадваюцца першыя пасляваенныя гады. Тады я, 15-гадовы гарманіст-самавук, быў ледзь не адзіным музыкам на ўвесь наш Брагінскі раён. У тыя нялёгкія дні мала каго хвалявала, што на вёсцы ў суботу ці нядзелю не чуваць вясёлых пераборaў гармоніка. Іншыя клопаты былі тады ў людзей.

Становішча карэнным чынам змянілася ў нашы дні. Не аб адным хлебе дбаюць сёння працаўнікі вёскі, як правільна аб гэтым пісаў на старонках газеты старшыня пінскага калгаса Ул. Козыр. Інтэлектуальныя патрэбы калгаснікаў цяпер такія шырокія і разнастайныя, што, па-першае, яны наўрад ці чым-небудзь адрозніваюцца ад запатрабаванняў жыхароў горада, а, па-другое, ужо ніводзін старшыня калгаса не адважыцца проста «адмахнуцца» ад задавальнення культурных патрэб хлебаробаў. Няспынны духоўны рост калгасных людзей ставіць сёння востра праблему далейшага развіцця культуры вёскі.

Слова «культура» надзвычай ёмістае і шматграннае. Я не стаўлю перад сабою задачу даследаваць гэтую праблему ва ўсёй яе складанасці. Мяне, работніка культуры, у першую чаргу хвалююць пытанні арганізацыі адпачынку хлебаробаў і сельскай інтэлігенцыі. Мне хацелася б падзяліцца сваім сціплым вопытам і некаторымі думкамі.

ЯК ДОБРА арганізаваць культурны адпачынак калгаснікаў і рабочых саўгасаў? Скажу шчыра — зрабіць гэта нялёгка. Тут, па сутнасці, у нас некранутая цаліна, якую трэба ўзнімаць і ўзнімаць, да якой трэба прыкласці і рукі, і сэрца, і веды, пакуль дачакаешся жаданых вынікаў. Багаты «ўраджай з культурнай цаліны» будзе, здаецца мне, перш за ўсё тады, калі людзям, што наведаюць клуб, захочацца лепш працаваць, зрабіць нешта добрае ў сваім калгасе, брыгадзе ці на ферме... Калі чалавек выйдзе з клуба нечым узбагачаны, і душа яго заспявае, радуючыся і сонцу, і ветру, і бязмежным калгасным палеткам... Калі яму закарціць прачытаць кнігу, якую назваў лектар, паслухаць канцэрт з твораў кампазітара, пра якія ішла гаворка на занятках універсітэта культуры, убачыць у арыгінале славутую карціну мастака, а можа і паспрабаваць свае сілы за мальбертам...

Словам, адпачываць—не значыць бяздзейнічаць, марна бавіць час. Адпачынак—гэта актыўная работа мозгу, узбагачэнне сваіх ведаў, гэта занятак любімай справай—музыкай, маляваннем, спортам, вышыўкай, ткацтвам, гэта—падарожжы па родным краі, вывучэнне яго гісторыі і нашай сённяшняй явы, запіс вусна-паэтычнай творчасці народа і г. д.

І як трэба многа ведаць работнікам культуры, якім трэба быць умелым арганізатарам, каб здолаць ператварыць нашы клубныя ўстановы ў своеасаблівыя «фабрыкі» добрага настрою, зрабіць іх цэнтрамі, дзе кожны знойдзе сабе занятак да спадобы.

Пачынаць загадчыку клуба даводзіцца, як кажуць, з «казоў»—са згуртавання вакол свайго дома культуры актыву энтузіястаў. Добра, калі культасветработнік умее іграць на баяне. Тады справы пойдуць значна лягчэй—адразу выявяцца аматары песень, танцаў, музыкі. Так нараджаецца калектыў мастацкай самадзейнасці, канцэрты якога на вёсцы заўсёды карыстаюцца поспехам.

А калі загадчык клуба—не музыкант і ў вёсцы няма баяніста, тады часцей за ўсё даводзіцца чуць скаргі на тое, што «клуб не працуе, у ім сумна, моладзі няма чым заняцца». Колькі такіх пісем атрымліваюць рэдакцыі рэспубліканскіх, абласных і раённых газет.

Мала хто з клубных актывістаў думае пра тое, каб, скажам, арганізаваць у клубе спартыўныя секцыі — валейбольную, баскетбольную, лёгкаатлетычную — летам, лыжную — зімою. На вёсцы цяпер многа веласіпедыстаў і матацыклістаў, і сярод іх можна наладзіць спаборніцтвы. Можна стварыць гурток фота- і кінааматараў. Краязнаўцы няхай пішуць гісторыю свайго калгаса, саўгаса, вёскі. Пад кіраўніцтвам спецыялістаў сельскай гаспадаркі можна заняцца эксперыментальнай работай—вырошчваць, напрыклад, новыя гатункі культур, на доследных дзялянках паляпшаць мясцовыя збожжавыя і тэхнічныя расліны, вывучаць вопыт перадавікоў калгаснай вытворчасці. У нейкі дзень можна запрасіць у клуб маладых мацярок, хай для іх урач прачытае цыкл лекцый, а старэйшыя жанкі падзеляцца вопытам выхавання дзяцей. Многа цікавых спраў можа быць у клубе сяброў беларускай літаратуры, на занятках якога будуць абмяркоўвацца новыя творы пісьменнікаў і вершы сваіх пачынаючых аўтараў. А чаму не стварыць клуб ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, клуб паляўнічых і рыбаловаў, сяброў прыроды? У кожнага такога аб'яднання можа быць столькі цікавых і карысных вечароў і сустрэч...

Гаворачы пра некаторыя клубныя мерапрыемствы, я не адкрываю тут нічога новага (ды і не ставіў перад сабой такой мэты). У нашых лепшых культасветустановах даўно працуюць і клубы па інтарэсах, і аматары-краязнаўцы збіраюць матэрыялы і экспанаты для калгасных музеяў, і спартыўныя секцыі ёсць. Я хачу толькі звярнуць увагу на тую акалічнасць, што клубная справа не церпіць людзей абыякавых і раўнадушных, не церпіць штампа ў рабоце і моцна помсціць тым, хто працуе ў культасветустанове не па закліку сэрца, а па абавязку.

Мне здаецца, што раённыя аддзелы культуры, Рэспубліканскі метадычны кабінет культасветработы ды і наш абласны Дом народнай творчасці, дзе я працую, мала яшчэ звяртаюць увагі на выхаванне грамадзянскіх рысаў у характары і паводзінах работнікаў культасветустаноў. Гэта не пустое пытанне, як выконваць свае абавязкі: ці чакаць склаўшы рукі дырэктыў «зверху», ці самому шукаць, непакоіцца. Ці заўсёды ёсць у нас гэтае высакароднае пачуццё заклапочанасці, ці заўсёды загадчык клуба, бібліятэкі памятае, што ён выхавацель, што ён работнік ідэалагічнага фронту? Упэўнены, што мы маглі б зрабіць намнога больш, каб выхаванню грамадзянскіх, патрыятычных пачуццяў аддавалі больш увагі. Вядома, адным сумнымі дакладамі і нуднымі павучаннямі гэтай справы не зрушыш, тут трэба шукаць сцяжынкі да сэрца кожнага культработніка, да яго сумлення. І вывад напрошваецца адзін—больш трэба клапаціцца пра выхаванне саміх выхавацеляў.

На жаль, прафесіянальная падрыхтоўка нашых клубных работнікаў адстае сёння ад культурных запатрабаванняў працаўнікоў вёскі. Часам мы сустракаемся з фактамі, калі клубам загадвае чалавек, які не мае нават васьмігадовай адукацыі. Што можа даць такі работнік калгасніку, які закончыў сярэднюю школу і завочна вучыцца ў інстытуце? Вядома, нічога. На шкоду нашай агульнай справе мы часам трымаем такіх работнікаў (маўляў, яны даўно працуюць) і не патрабуем ад іх, каб яны вучыліся.

СЕННЯ мы не ўяўляем сабе клуба, у якім не было б калектыву мастацкай самадзейнасці. Трэцяя Дэкада народнай творчасці паказала, што калгасныя артысты паспяхова спаборнічаюць з гарадскімі. Надышоў час, калі ў кожным калгасе і саўгасе павінен быць кваліфікаваны музыкант. Але дзе яго ўзяць? Такіх спецыялістаў у нас не хапае. Нашы музычныя школы і вучылішчы не могуць задаволіць шматлікіх заявак калгасаў і саўгасаў.

Патрэбна рыхтаваць кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці на кароткатэрміновых курсах, якія працуюць у Мінску і пры абласных дамах народнай творчасці. Дзевяці месяцаў навучання на гэтых курсах хопіць, каб іх выпускнік мог наладзіць работу хору, танцавальнага калектыву, салістаў-вакалістаў.

У Гомельскай вобласці такія курсы працуюць шэсць гадоў. Мы выпусцілі ўжо каля трохсот чалавек. Баяністы, кіраўнікі хораў і аркестраў у большасці сваёй вучыліся на калгасныя сродкі.

Пасля сканчэння навучання выпускнік абавязаны прыехаць на работу ў калгас, які пасылаў яго на курсы. На першым часе былі ў нас, праўда, выпадкі, калі нашы выхаванцы адмаўляліся ехаць у свой калгас. Тады мы вырашылі папярэдне афармляць з кожным курсантам своеасаблівы дагавор, у якім запісана, што ён абавязаны пасля заканчэння вучобы працаваць у сваім калгасе не менш двух-трох гадоў. Дыпломы аб заканчэнні курсаў вырашылі выдаваць толькі праз год. Гэта дало станоўчыя вынікі. У нас ужо няма «летуноў». Сёлета мы ўпершыню выдалі пасведчанні тым, хто папрацаваў у калгасе не менш года. А зрабілі яны за гэты час сапраўды нямала. Пасланец саўгаса «Ельскі» А. Пінчук вучыўся на курсах выдатна. Таксама старанна працуе ён і ў самадзейнасці, стварыўшы духавы аркестр, які за-

[Заканчэнне на 4-й стар.].



П. ЦОМПЕЛЬ. Шматфігурны рэльеф мемарыяла «Небат» (гліна). (З дыпломных работ выпускніка Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

ТЭАТР

«ПОЛЬСКІ МАЛЬЕР» У КОЛАСАЎЦАЎ

Больш ста год не сходзіць са сцэны жыццярадасная, вострая, гарэзлівая камедыя «Дамы і гусары», напісаная Аляксандрам Фрэдра ў 1825 годзе ў Львове. Там жа яна была ўпершыню і пастаўлена. І вось нядаўна, у чэрвені, знаходзячыся на гастролях у Львове, Беларускі дзяржаўны тэатр імя Якуба Коласа прапанаваў гледачам сваю прэм'еру «Дамы і гусары».

Для твораў А. Фрэдра характэрны жывасць дыялогаў, дынамічныя сцэнічныя сітуацыі. Па сваім характары і праблематыцы яны падобныя да твораў вядомага французскага камедыёграфа Мальера. А. Фрэдра нават называюць «польскі Мальер».

Камедыя «Дамы і гусары» расказвае аб жыццярадаснай маладосці, аб палымяным каханні. Стары маёр, якому за пяцьдзесят і які правёў усё жыццё ў паходах, спыняецца з гусарамі ў сваім маёнтку. Сёстры маёра вырашылі ажаніць свайго брата з маладзенькай пляменніцай Зосяй. Зося ж даўно закахана ў паручніка — сябра маёра (паручнік у адным з баёў выратаваў яго ад смерці). Стары маёр і слухаць не хоча пра жаніцьбу. Аднак жанчыны зрабілі ўсё, каб нарэшце маёр так расчуліўся, так захапіўся прыгажосцю Зосі, што забыўся і на розніцу ў гадах, і на тое, што яна — яго пляменніца. Паручнік і Зося ў роспачы. Тым часам маёр даведваецца, што паручнік даўно кахае Зосю. Расчулены, ён адмаўляецца ад жаніцьбы, аддае паручніку свой маёнтак.

Спектакль у пастаноўцы коласаўцаў атрымаўся жыццярадасны, вясёлы. Артысты тонка адчуваюць нацыянальную спецыфіку характараў персанажаў. З'яўляючыся на сцэне гусары — і адразу адчуваеш, што гэта польскія гусары.

Цудоўна зроблена сцэна размовы ротмістра (артыст А. Шэлег) з Анэляй (артыст М. Маркоўская). Анэля ведае, чым зацікавіць бравага рубаку ротмістра. Яна гаворыць пра тое, што так любіць коней, ваенныя паходы, нават люльку, што шкадуе, чаму яна не нарадзілася мужчынам!.. Усё гэта імпануе ротмістру. Ён ажно заіскрыўся, засвяціўся ўвесь. Партнёры ў гэтай сцэне складаюць цудоўны ансамбль.

Вось такога адчування партнёра няма, на жаль, у паручніка — Г. Дубава. Па аўтарскай задуме паручнік — душа усёй кампаніі, жыццярадасны, малады чалавек. Але на сцэне мы гэтага пакуль што не бачым. А між тым імкненне праз маладосць паручніка, праз яго юнацкі запал і павінна па кантрасту паказваць сталасць яго таварыша. У спектаклі ж кожная гераіня хутчэй закахаецца ў маёра, ротмістра, Гжэгажа — бо іх маладосць больш выразная, чым натуральная маладосць паручніка. Нават і ў, танцах яны маладзейшыя.

Хацелася б адзначыць удачу акцёра Б. Левіна ў ролі капітана. Гэта не ксёндзаскет. Ён такі ж гусар, як і ўсе. Аднак сам прымушае яго крыху стрымліваць свае пачуцці. Выконваюча добра разуме задачу ролі і стварае вобраз чалавека, які ўвесь час змагаецца сам з сабою.

Але прыглядаючыся да старога Гжэгажа, да маёра, ротмістра, капітана, не заўсёды хочаш смяяцца з іх халасцяцкага жыцця. Пачынаеш адчуваць іх трагедыю. Гэтых людзей палохае старасць. «Пражылі век у паходах, выконвалі загады, — кажа маёр, — а што будзе далей?..» Аднак гэтая лінія — страх старых байцоў перад будучыняй — слабавата раскрыта ў спектаклі рэжысёрам - дыпламантам С. Ларыёнавым.

У большасці п'ес А. Фрэдра — глыбокі падтэкст. У п'есе «Дамы і гусары» аўтар высмейвае стары памешчыцкі лад польскага жыцця, яго нікчэмнасць. Ён паказаў, што гэты лад пайнен адысці ў мінулае. Гэтая лінія ў спектаклі раскрыта, на маю думку, удала.

С. МІСКО.

ДАРАГОЕ СЭРЦУ...

Савецкай Літве — дваццаць пяць год. Расце і прыгажэе сталіца рэспублікі—Вільнюс, горад, з імем якога звязана і развіццё беларускай культуры.

Мінскі архітэктар мастак І. Мядзведзеў доўгі час жыў у Вільнюсе. Ён прымаў удзел у аднаўленні горада пасля Вялікай Айчыннай. Старому і новаму Вільнюсу мастак прысвяціў серыю работ. Тры з іх мы прапануем увазе чытачоў.

АНСАМБЛЬ КАСЦЁЛАЎ АННЫ І БЕРНАРДЫНЦАЎ.

ВУЛКА Ў СТАРОЙ ЧАСТЦЫ ГОРАДА.

ДОМ ВУЧОНЫХ У ВІЛЬНЮСЕ.

НА ВЫСТАЎЦЫ Ў МАСКВЕ

У Цэнтральным Доме архітэктара ў Маскве экспануецца выстаўка фатаграфій выдатных помнікаў дойлідства нашай краіны. Побач з помнікамі Маскоўскага Крамля, Ленінграда, Ноўгарада, Пскова, Кіева, Уладзіміра тут можна ўбачыць многія помнікі беларускай архітэктуры.

Вялікае ўражанне на наведвальніка робяць здымкі вядомай Спас-Ефрасіньеўскай царквы ў Полацку—помніка XII стагоддзя, Гродзенскай крапасной сцяны, збудаванай у XVI стагоддзі, царквы ў Сынкавічах, замку ў горадзе Міры, Холмскіх варот Брэсцкай крэпасці.

У кнізе водгукаў выстаўкі шмат запісаў наведвальнікаў, якія выказваюць пажаданне наведаць Беларусь і ўбачыць на месцы помнікі старажытнага дойлідства.

М. ПІЧХАДЗЕ,
мастацтвазнаўца.

МАСТАЦКІ ВОБРАЗ ГОРАДА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

гінальныя архітэктурныя вобразы збудаванняў, знайсці цікавыя прасторавыя вырашэнні вестыбюляў, холаў, глядзельных залаў, шырока ўжываючы шкло, дрэва, натуральны камень, пластык і алюміній.

Сёння прыгажосць жылога дома мы імкнёмся вывесці перш за ўсё з яго прызначэння.

Нам патрэбна даць кожнай сям'і выгодную светлую кватэру. І гэтая задача паспяхова вырашаецца. У тыпавых дамах палепшана планіроўка. Аднак наша жыллё павінна быць не толькі выгодным. Вонкавае аблічча новых дамоў і інтэр'ер іх павінны быць прыгожымі. Панельныя і цагляныя жылыя дамы сёння яшчэ ў многім не адпавядаюць гэтай умове. І таму архітэктары праектуюць новыя тыпавыя будынкі, у якіх прыгожыя фасады, інтэр'еры не парушаюць функцыянальнай мэтазгоднасці. Будуюцца новыя панельныя дамы ў Мінску — у Зялёным Лузе, на вуліцах Тімбухіна, Харкаўскай. Лоджыі, высокай якасці панелі, афактураныя прысыпкамі з натуральнага каменю, добра падабраны колер, дах з унутраным водасцёкам, казыркі над уваходам і экраны на балконах — усё гэта стварае новую архітэктурную прыгажосць жылых кварталаў.

Каб нашы кватэры сталі эстэтычна выразнымі — мала стварыць добрую планіроўку, знайсці добрыя прапорцыі памяшканняў, вокнаў і дзвярэй. Трэба яшчэ дабіцца высокай якасці будаўнічых работ. Тут, на жаль, яшчэ многа недаробак. Мастацкае аблічча інтэр'ера залежыць і ад таго, з якога матэрыялу зроблена падлога, плінтусы, як вырашаны сцены, якія пастаўлены ручкі да дзвярэй і шпінгалеты да вокнаў. Трэба шырэй ужываць новыя матэрыялы. Пакуль жа ў нас іх вельмі мала. Падлогу з пластыку робяць рэдка. Невялікі выбар і жалезных тавараў.

Асобна трэба сказаць пра шпалеры. У Мінску працуе шпалерная фабрыка. Аднак многія ўзоры яе прадукцыі вельмі нізкія па мастацкіх вартасцях. Да гэтага часу ў Мінску няма вялікага фірменнага магазіна шпалер. І вось даводзіцца мінчанам ездзіць па шпалеры ў Вільнюс і Рыгу, Ленінград і Маскву. А калі архітэктарам трэба вырашыць інтэр'ер кватэры, дык яны не маюць з чаго выбраць і згаджаюцца на тое, што ёсць.

НОВЫ ГОРАД — гэта не сума кварталаў. Гэта прадуманая ў дэталях арганізацыя жылых раёнаў і мікраёнаў, аб'яднаных транспартнымі магістралямі, сістэмай абслугоўвання насельніцтва.

Фігура спартсмена прыгожая, калі ўсё ў ёй гарманічна развіта, мускулатура яго ўдасканальваецца ў выніку таго, што кожны орган бярэ на сябе адпаведную фізічную нагрузку. Так і ў горадзе: калі ў ім правільна арганізаваны транспарт, комплексы «жыллё — прамысловасць», калі добра наладжаны адпачынак і абслугоўванне насельніцтва, — дык эстэтычныя праблемы змогуць знайсці натуральнае вырашэнне.

Гэта не значыць, што ў сучаснай архітэктуры праблемы аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі адыходзяць на задні план. Але кампазіцыя сёння не дыктуе свае «законы» пабудовы архітэктурных ансамбляў, зыходзячы з нейкіх прадузятых палажэнняў, як гэта было яшчэ дзесяцігоддзе назад. Кампазіцыя і прызначэнне будынка ці комплексу сталі ўзаемазвязанымі, узаемападпарадкаванымі. Усё, што арганічна вынікае з правільнай арганізацыі горада, становіцца выразным і ў эстэтычных адносінах.

Якая ж стане вуліца нашых гарадоў у недалёкай будучыні?

Яна перастане быць месцам прагулак і выстаўкаю фасадаў прыгожых дамоў. Вуліца — гэта перш за ўсё транспарт. Гэта скорасць, памножаная на адлегласць. Новая гарадская магістраль вусім не падобная на ранейшую вуліцу-калідор. Яна выразна скіравана. У яе шырокая праезджая частка, уздоўж якой працягнуліся шырокія палосы зеляніны, лёгка падымаюць свае «шыі» сучасныя свяцільнікі. А за зеляніною магістралі відаць дамы мікраёнаў, прызначаныя перш за ўсё для жылля. Гэта прынцыпова новае стаўленне да горада. Магістралі — для транспарту, мікраёны—для людзей.

Забудова ўздоўж магістралей набывае ўзбуйнены маштаб. Узнікае шматпланавая перспектыва дзякуючы прасторава развітым кампазіцыям мікраёнаў. На такой магістралі нязграбна будуць выглядаць порцікі і каланады.

На гэтым новым шляху развіцця нашай архітэктуры не абыходзіцца без суперэчнасцей. У апошні час мы занадта захапіліся тыпізацыяй і уніфікацыяй. І хоць савецкі архітэктар Бураў аднойчы дасціпна зазначыў, што аднастайныя зручнасці лепш за разнастайныя нязручнасці, але сёння мы ўжо не можам лічыць нармальным становішча, калі сродкі архітэктурна-прасторавай кампазіцыі настолькі абмежаваны, што нашы дамы — і панельныя і цагляныя—дасягнулі «мяжы паўтараемасці». На жаль, нават у некаторых новых работах архітэктары імкнуцца «акантурваць» мікраёны, г. зн. акружаць яго па перыметру дамамі радковай забудовы. Гэта адбываецца таму, што некаторыя нашы архітэктары яшчэ не авалодалі ўменнем правільна развіць прасторавую кампазіцыю, яны механічна выкарыстоўваюць прыцыпы «акантурвання» кварталаў. А для мікраёнаў гэта супрацьпаказана. (Такую планіроўку можна сустрэць і ў Гомелі, і ў Гродна). А калі да гэтага дадаць яшчэ і аднастайныя па прыёму спалучэнні з тыпавых дамоў, аднастайнае іх каляровае вырашэнне, дык наўрад ці можна гаварыць пра тое, што мы стваралі своеасаблівыя і па-мастацку выразныя комплексы

Вось такія жылыя дамы на 12—16 паверхаў, эручныя, прыгожыя, можна будзе ўбачыць праз некалькі год у мікраёнах сталіцы.

Мы ўсё яшчэ сутыкаемся з тэндэнцыяй выключыць архітэктуру са сферы мастацтваў. Нават факт прысуджэння Ленінскай прэміі за Палац з'ездаў у Маскве па раздзеле тэхнікі сведчыць пра гэта. Але ж у будынку Палаца з'ездаў пытанні тэхнічныя яўна саступаюць праблемам вялікай архітэктуры, эстэтычны пачатак у гэтым збудаванні пераважае!

Настаў час сур'ёзна сказаць, што, распрацоўваючы тыпавыя праекты, трэба думаць і пра эстэтычную іх вартасць. Бо нашым дамам і нашым архітэктурным комплексам суджаны многія дзесяцігоддзі жыцця. Пабудаванае сёння павінна адпавядаць усё больш узрастаючым эстэтычным патрэбам.

Архітэктары Мінска і іншых гарадоў Беларусі шмат думаюць над тым, каб зрабіць прыгожымі нашы новыя раёны. У мікраёне Зялёны Луг добра выглядае галоўная яго частка з боку Лагойскай шашы, дзе выраслі тры дзевяціпавярховыя дамы, якія надалі забудове маляўнічасць. Сярод ужо існуючых пяціпавярховых жылых дамоў у найбольш выгадных мясцінах будзе пастаўлена яшчэ некалькі высокіх будынкаў — яны значна ўзбагацяць сілуэт гэтага раёна. Неўзабаве ў яго цэнтральнай частцы будзе пабудаваны грамадска-гандлёвы цэнтр. Вялікія плоскасці сцен будуць кантрасна спалучацца са шклянымі паверхнямі.

Арыгінальна плануецца забудова раёна па вуліцах Бондараўскай і Высокай. Яна добра праглядаецца з боку Ленінскага праспекта ля філармоніі. Ужо сёння першыя, размешчаныя на схіле, беласнежныя будынкі прыцягваюць увагу. А неўзабаве да гэтых будынкаў далучацца шкляныя аб'ёмы магазінаў. Завершыцца добраўпарадкаванне бульвара, што вядзе ад філармоніі да адзінаццаціпавярховага жылога дома, які будзе пастаўлены на гары.

Новы раён Чыжоўка, размешчаны ў цудоўных прыродных умовах ля вадасховішча, стваралецца на аснове дасягненняў, набытых за апошнія гады ў галіне горадабудавання.

Ва ўсім новым, што ствараем, мы імкнёмся адыходзіць ад шэрасці і безаблічнасці. Мы будзем між тыпавымі пяціпавярховымі ставіць дванаццаці- і шаснаццаціпавярховыя жылыя і грамадскія будынкі, шукаць маляўнічасць у супастаўленні розных аб'ёмаў.

УАБЛІЧЧЫ новага горада вялікае значэнне маюць добраўпарадкаванне, азеляненне, колер, дэкаратыўнае аздабленне. Удала спланаваная пляцоўка з газонам, акаймаваным выразным бартавым каменем, маляўніча пракладзеныя ў эручных напрамках дарожкі для пешаходаў, пасаджаныя з густам дрэвы і кусты ў спалучэнні з падпорнымі сценкамі, лаўкамі і г. д., — усё гэта дае прыгожую і прыемную кампазіцыю. Але, на жаль, сёння добраўпарадкаванне і азеляненне мікраёнаў (і старых і новых) робіцца паспешліва, а часам нават і непрафесіянальна. Газоны не плануюць, дрэвы садзяць абы-як, не заглядаючы ў праект. А архітэктар жа і інжынеры па азеляненню заўсёды шукаюць пэўную кампазіцыю з розных парод дрэў і кустоў, яе каляровае вырашэнне для розных пор года.

У прымяненні малых форм архітэктуры ў нас да гэтага часу пануе блытаніна. Выканком Мінскага гарсавета зацвердзіў альбом новых малых форм для мікраёнаў. Тут прыгожыя сучасныя элементы добраўпарадкавання. Аднак яшчэ і дагэтуль у мікраёнах з'яўляюцца неэстэтычныя старадаўнія альтанкі, лаўкі, качалкі, агароджы. Нават у аздабленні парку, дзе, здавалася б, павінна было адчувацца вока спецыяліста, мы ўсё яшчэ бачым вазы з акантавымі лістамі, якія па волі камендантаў фарбуюць то ў серабрысты, то ў блакітны колер. Відавочна, пры вырашэнні памянёных праблем трэба пачынаць з малога. Неабходна, напрыклад, ліквідаваць безгустоўныя агароджы, замяніць іх зеляніной, убраць непрыгожыя вазы ў нашых парках, абнавіць рэкламу.

Асабліва ўмела і актыўна мы павінны сёння выкарыстоўваць колер. У масавых комплексах мікраёнаў ён можа «гучаць» па-рознаму. Ужываць яго трэба з густам — трэба імкнуцца да высакароднай мяккай колернай гамы пастэльных тонаў. Ні ў якім разе нельга дапускаць крыклівай стракатасці. У нашых жа мікраёнах нярэдка парушае адзінства ансамбля імкненне стракатасць.

Архітэктура атрымлівае сваё лагічнае завяршэнне ў выніку сінтэзу мастацтваў — архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога і манументальнага. Сёння дэкаратыўныя элементы ўводзяцца ў практыку масавага будаўніцтва. Першыя крокі зроблены і ў Мінску. Можна назваць роспісы і вітражы ў новым корпусе Палаца піянераў, у спартыўнай зале інстытута фізкультуры, з графіта ў зале тэхналагічнага інстытута, рэльеф і мазаіку ў Палацы культуры камвольнага камбіната. Таленавітыя мастакі-манументалісты Г. Вашчанка, Ул. Стальмашонак, І. Рэй, І. Эдэльман і іншыя смела вырашаюць дэкаратыўныя элементы ў новых інтэр'ерах. На жаль, аздабляць дамы дэкаратыўнымі элементамі ўдаецца толькі ў рэдкіх выпадках; калі сёння ўспамінаеш слова «дэкаратыўнае», дык фінансавыя органы ўспрымаюць яго як «марнатраўства». Відаць, кіруючым органам патрэбна ўнесці яснасць у гэтае пытанне, бо такая «барацьба з марнатраўствам» адмоўна адбіваецца на развіцці манументальнай прапаганды.

УСЕ Ў НАШАЙ архітэктуры—вонкавае аблічча горада і мікраёна, аздабленне інтэр'ераў, мэбля, кераміка, тканіны — павінна ствараць на аснове сучасных уяўленняў аб прыгажосці. Праблемы эстэтыкі сёння шчыльна звязваюцца з жыццёва важнымі працэсамі ў архітэктуры, абумоўленымі шматграннымі запатрабаваннямі грамадства, якое будуе камунізм.

Сярод кніг

ТАЛЕНТ ДАБРАТЫ

С. ГРАХОЎСКІ
ПАМЯЦЬ
«Беларусь»
1965

На адной з першых старонак новай кнігі Сяргея Грахоўскага «Памяць» надрукаваны кароткі верш. Ён просты, але гэта тая самая прастата, якая гаворыць не аб беднасці думкі, а аб яе сталасці:

Каб пісаліся вершы,
Трэба быць закаханым
У жанчыну, у неба,
У добрых людзей,
І ад шчасця заўсёды
Быць крышачку п'яным,
І ніколі, ніколі
Не траціць надзей.

На гэтым, уласна, можна было б і спыніцца, бо думка па сутнасці закончана. Аднак верш на гэтым не канчаецца:

Трэба быць закаханым
У гоманы бору,
У світанні над полем,
У дожджы на сяўбе,
Трэба быць закаханым
У сінія зоры...

Гэтыя радкі, па сутнасці, нічога не дадаюць да таго, што ўжо было сказана. Яны нават выклікаюць лёгкае раздражненне — ці трэба гаварыць аб рэчах даўно вядомых, гаварыць без спробы павярнуць іх нейкімі новымі бакамі?

Але вось чытаеш два апошнія радкі — і адбываецца ператварэнне звычайнага ў паэтычнае:

...І ніколі, ніколі —
У самога сябе.

Верш адразу нібы па-новаму асвятляецца, пачынае па-новаму хваляваць...

Змешчаны ў самым пачатку кнігі, гэты верш, на маю думку, вызначае самую сутнасць паэзіі С. Грахоўскага — закаханасць у жыццё, у людзей, ва ўсё, што складае першааснову чалавечага быцця.

Есць розныя лірычныя паэты. Адны ўвесь час строга трымаюцца толькі свайго ўласнага «я», другія — імкнуцца часцей звяртацца да абагуленага, а часам і неакрэсленага «мы». С. Грахоўскі ўнікае крайнасцей адных і другіх. Ён любіць гаварыць «я» — і гэта надае таму, пра што гаворыць, лірычную верагоднасць, шчырасць,— але часта тут жа дадае «мы»:

Я не шукаў тут лёгкае работы...
З жалезнаю адмакалёснай тачкай
Мы абагнулі тры разы экватар,
Хоць і не выйшлі з цэхавых варот...

Гэтыя ўдала знойдзеныя суадносіны індывідуальнага «я» і вельмі канкрэтнага, рэальнага «мы» пазбаўляе вершы С. Грахоўскага самалюбавання і рыторыкі. Калі ж суадносіны парушаюцца, тады жывое, індывідуальнае «я» падмяняецца нечым абстрактным, і ўмоўным. Так здарылася, напрыклад, у вершы «Зямлянін я». Да чытача тут звяртаецца ўжо не сам паэт, а нейкі яго двайнік, які не гаворыць, а рытарычна, самазадаволена вяшчае:

Я перадам святую праўду
веку,
Што ў промнях сонца, з
дыму і крыві
Да новых зор узнесла
чалавека
Для шчасця і вялікае любві.

Тая ж галоўная думка, дзеля якой напісаны верш, выказана бледна, празаічна, без хвалявання і роздуму:

Мы не дадзім не (Зямлю — Ф. Я.) крывёй запляміць,
Жывое растаптаць і
спапяліць!

Вельмі добра, што верш гэты не характэрны для зборніка «Памяць» — большасць твораў паэта па-сапраўднаму хвалюе, бо народжаны яны хваляваннем, пакутамі, радасцю, сумам аўтара...

У наш складаны і сур'ёзны час хто не думаў над такім пытаннем: а што было б, калі б жыў Ленін? Задумаўся над ім і С. Грахоўскі:

Яшчэ ж яго паплечнікі
працуюць
І выступаюць на партыйных
з'ездах,
Любуюцца святочнаю
Масквою.
Яшчэ яго равесніка жывуць.

А што было б, каб Ленін
жыў дагэтуль?
Нікога б мы не страцілі
ніколі,
Пабудавалі б, што збудуем
заўтра,
Зрабілі больш і менш
перажылі б.

У гэтым звычайным пытанні — «А што было б, каб Ленін жыў дагэтуль?» — наш роздум аб мінулым і будучым, наша імкненне ўсё рабіць толькі па Леніну.

Увогуле аб мінулым часе, калі паэту давялося шмат перажыць, ён піша без націску, без азлаблення. Яго больш вабіць будучыня, якая, вядома, немагчыма без уліку ўрокаў мінулага. Аб мінулым ён гаворыць часам нібы мімаходзь, але прымушаючы чытача асэнсаваць яго зноў і зноў:

Цяпер адны спраўляюць
юбілеі,
Другіх скасіла смерць пад
Ленінградам,
Пад Мінскам, пад Варшавою,
Берлінам,
А іншых — на дарогах
Калымы.
(«Памяць»).

Не ведалі б трывог і
недаверу,
Не чулі б пра ужлагі
і сіблагі...
(«Тры вымярэнні»).

Усё скупа, без акцэнту на старыя, пякучыя раны. Толькі ў адным вершы (дарэчы, адным з самых лепшых у кнізе і наогул у творчасці С. Грахоўскага) прарываецца боль і гнеў на несправядлівасці часоў культу. Верш называецца «Душа». Ён тэмпераментны і суровы: «Мяне... і замыкалі, і пад пломбамі, нібы каштоўнасць, берагліі...» Той, хто замыкаў, і той, каго замыкалі, слова **каштоўнасць** разумелі па-рознаму. Імя сапраўднай каштоўнасці адно — душа чалавечая, і яна «супраціўлялася, бо верыла і тым жыла, бо не чарсцвела, не ламалася — была такою, як была».

Але гэта яшчэ не ўся праўда. За гэтым ідуць самыя галоўныя, выпакутаваныя словы:

Хоць дзіўна,
ў чым яна трымалася.
А паспрабуй
Яе сагні!
Яна ж з маленства
Гартавалася
На чыстым,
Праведным агні.

Юнацтва паэта, як і юнацтва яго пакалення, было асветлена «чыстым, праведным агнём» Кастрычніцкай рэвалюцыі. Памяць аб гэтым жыве ў сэрцы паэта, як і ў сэрцах тысяч людзей. Адсюль, відаць, і назва кнігі.

Праўда, «знешне» яна паходзіць, магчыма, і ад аднайменнага верша — сціслага нарыса юнацтва паэта і яго пакалення. Мы ўжо цытавалі асобныя радкі з гэтага верша. Хочацца прывесці яшчэ некалькі радкоў.

З балючым смуткам піша паэт пра тых, ад каго засталіся толькі «пахаронкі». Але вось пачынае гучаць іншая тэма — тэма таго самага «чыстага праведнага агню», які па-ранейшаму ярка палае:

...Асталася нашая Радзіма,
Чырвоны сцяг і ленінская
праўда,
Што стала вечным компасам
сумлення,
Што ў строй вярнула
мёртвых і жывых.

А яшчэ — «асталася дабрата людская». Гэтая каштоўная чалавечая якасць больш за ўсё прываблівае ўвагу паэта. З вершаў пра дабрату можна было б скласці цэлы цыкл. Можна было б так назваць усю кнігу, таму што ўся яна — пра дабрату, уся прасякнута ёю, дыхае ёю. «Светлым талентам» называе паэт дабрату і хоча, каб дабрата цанілася як талент, але не была рэдкай, таму што яна вельмі патрэбна людзям:

Чалавеку не трэба
спагады —
Дабрата чалавеку патрэбна...

У пачатку другога раздзела «Памяці» — на мой погляд, самага моцнага ў кнізе — змешчаны верш «Як хлеб надзённы». Паэт гаворыць аб тым, як маці пякла хлеб. Але гэта не дэманстрацыя пазнанняў аўтара ў галіне хлебапячэння, а наказ самому сабе і таварышам па пяру:

Палёгак і скідак, паэт, не
прасі ты,—
Пачуці і словы
Прасейвай праз сіта...

Трэба, праўда, прызнаць, што гэтай добрай парады паэт трымаецца не заўсёды. Мы ўжо гаварылі аб налёце рыторыкі ў вершы «Зямлянін я». Ёсць недахопы і ў іншых вершах. Самы прыкметны з іх — апісальнасць. Так, добра зробленыя строфы верша «Грузавікі» зведзены да звычайнага апісання працы шафёра. Не заўсёды ўдаюцца С. Грахоўскаму кароткія вершы, накшталт «Белых вершаў» і «Рэактыўнай лыжні» — не ўдаюцца, відаць, таму, што гэта не яго стыхія.

Заканчваючы гэтыя нататкі, хочацца яшчэ раз падкрэсліць, што кніга С. Грахоўскага «Памяць» па-добраму мяне ўсхвалявала і ўзрадавала. Думаецца, што гэтыя ж пачуцці абудзіць яна і ў іншых чытачоў.

Фёдар ЯФІМАЎ.

ВЕТРАЗІ ПАЭТА

А. МАРЦІНОВІЧ
ЧЫРВОНЫЯ ВЕТРАЗІ
«Беларусь»
1965

Зборнік вершаў А. Марціновіча «Чырвоныя ветразі» — не чарговая ў звычайным сэнсе гэтага слова кніга паэта. Гэта — свайго роду выбранае: самы ранні верш у зборніку датаваны 1939 годам (у анатацыі ж да кнігі сказана: «Першыя вершы А. Марціновіча з'явіліся ў друку ў 1938 годзе...»).

А. Марціновіч належыць да таго пакалення, чыё юнацтва прыйшлося на суровыя гады вайны, брала ў ёй самы непасрэдны ўдзел. Ваенным выпрабаваннем, калі «тушыліся пажарамі зоры», калі ішоў «бой за бяссмерце Радзімы», прысвечана ў зборніку не шмат вершаў, але ў кожным з іх за простымі, а часам і паспешлівымі, шурпатымі радкамі можна ўбачыць дарагую для нашай памяці старонку нялёгкага жыцця салдата-беларуса, адчуць яго боль за спаленую і пакалечаную Беларусь. І «Бітва на Волзе», і «Цыганка-сербіянка», і «З акна шпіталя» — усё гэта вершы пра чалавечыя раны і боль, пра Радзіму, да якой вядуць толькі шляхі барацьбы. Маладому паэту выпаў лёс на гэтых цяжкіх шляхах пазнаць «...самаахвярнасць, сталасць у жыцці, і мужнасці прыход, і перамог ірдзенне». Тут яго характар атрымоўваў ідэйную загартоўку, тут у ім выхоўвалася грамадзянская прынцыповасць і тая маральная чысціня і бескампраміснасць, якія адчуваюцца і ў сённяшніх творах паэта.

Даволі плённа працаваў А. Марціновіч і адразу ж пасля вайны, хоць, не ўтоім, вершы 1946 — 1948 гадоў у большасці выпадкаў халаднаватыя, без асаблівых прыкмет лірычнага хвалявання.

Потым ідзе верш «Легенда» (1957), прасякнуты сардэчным клопатам паэта пра жанчыну-маці, пра яе самотны дом, куды «не суджана вярнуцца болей сыну», які — адзін з яе — загінуў на вайне. Твор цікавы перш за ўсё пільнай і, хочацца дадаць, чалавечнай увагай паэта да простай жанчыны, чыя рана «і цяпер агнём гарыць».

Паступова, з верша ў верш, распе кола «чалавеказнаўчых» інтарэсаў паэта. Да яго, як сведчанне сталасці, часцей і часцей прыходзіць роздум над жыццёвымі з'явамі. Сузірае паэт карціну асенняй заспакоенасці зямлі, якая, «свае дары аддаўшы людзям, са смакам спачывае, як работнік», ці ўспамінае сяброў, што, «мала зведаўшы ў жыцці, галовы на вайне злажылі», або згадвае дарогі, «па якіх не змог прайсці», ці «загоны пачарнелай збажыны на полі адстаючага калгаса», — ён заўсёды востра адчувае ўсёй істотай «патрэбу жыць з гарэннем і турботай»,

Бо шмат яшчэ нязробленага,
шмат...
Працуй жа, не спыняйся, брат.
І за сяброў, што не прыйшлі
з вайны,
Працуй, — каб плён заўсёды
быў двайны.
(«Роздум»).

Відаць, я не памылюся, калі скажу, што паглыбленне роздуму пра чалавека і яго справы, вострая грамадзянская зашкаўленасць прывялі А. Марціновіча да паэмы «Сузор'е Лебедзь», у якой ён спрабуе асэнсаваць трагічныя падзеі 1937 года.

Паэма сведчыць аб пашырэнні ідэйнай асновы паэзіі А. Марціновіча, часта даволі камернай і кволай. Адсюль, мабыць, вынікаюць і пошукі паэта, настойлівы зварот яго да новых форм, у прыватнасці, да верша «свабоднага», набліжанага да прозы. Ну, ды галоўнае не ў гэтым, не ў вытлумачэннях, а ў тым, што лепшыя творы паэта трывала звязаны з нашым жыццём, з яго праўдай. І таму спадзяёшся, што ў далейшым яны будуць яшчэ больш напоўнены дыханнем сучаснасці, глыбінёй роздуму над нашым складаным і велічным часам.

Ул. ГНІЛАМЕДАЎ.

У многіх краінах свету людзі чытаюць творы беларускіх пісьменнікаў.
Наш чытач В. Ганчарэнка пабываў на рэспубліканскай кніжнай базе Упраўлення кніжнага гандлю Камітэта па друку і сфатаграфаваў таваразнаўцу аддзела «Кнігазнешгарт». Яны камплектуюць чарговую партыю кніг, прызначаных для адпраўкі ў зарубежныя краіны.

Іларыёну БАРАШКУ — 60 гадоў

25 ліпеня празаіку Іларыёну Барашку споўнецца 60 гадоў. Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі звярнулася да юбіляра з прывітаннем, у якім гаворыцца:

«Дарагі Іларыён Мацвеевіч!

Горача віншуем Вас, нашага таварыша па пяру, з 60-годдзем з дня Вашага нараджэння.

З маладых год Вы звязалі сваю дзейнасць з культурным будаўніцтвам Савецкай Беларусі і беларускай літаратурай. Многія з нас, старэйшых пісьменнікаў, памятаюць Вас на пасадах адказнага сакратара часопіса «Полымя» ў першы год яго існавання, рэдактара часопіса «Малады араты», намесніка рэдактара часопіса «Маладняк», у якіх друкаваліся першыя творы многіх вядомых цяпер паэтаў і празаікаў, і Вашы кнігі апавяданняў і нарысаў, аповесць «Рыгор Галота» з'явіліся значным укладам у нашу літаратуру.

Нямала зроблена Вамі і для развіцця беларускага кінамастацтва, асабліва навукова-папулярнага. Пастаўленыя па Вашых сцэнарыях кінафільмы «Якуб Колас — народны паэт Беларусі», «У свеце кніг», «Георгій Скарына» і іншыя нарыстаюцца заслужаным поспехам у гледачоў.

Ад усяго сэрца жадаем Вам, дарагі Іларыён Мацвеевіч, добрага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, бадзёрасці і творчага настрою».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання, жадае юбіляру шчасця і творчых поспехаў.

З КАГОРТЫ СТАРЭЙШЫХ

Міхась ЛЫНЬКОЎ

Больш як сорак год назад, у снежні 1924 года, у часопісе «Работніца і сялянка» было надрукавана апавяданне «Сельсаветчыца Параска». Той год і быў па сутнасці годам нараджэння Іларыёна Барашкі як пісьменніка, першым творам якога было гэтае апавяданне. Тады яму было 19 гадоў.

Нарадзіўся ён 25 ліпеня 1905 года ў сям'і рабочага Мінскай шпалернай фабрыкі.

Маленства і ранняе юнацтва будучага пісьменніка праходзілі так, як і ў кожнай рабочай сям'і. Беднасць, нястачы, няўпэўненасць у заўтрашнім дні, вечныя клопаты па надзённы кавалак хлеба, боязь страціць работу, жорсткая эксплуатацыя павукамі-фабрыкантамі — такія былі ўмовы жыцця і працы любой рабочай сям'і таго часу.

Кастрычніцкая рэвалюцыя ўнесла карэнныя змены ў гэтыя ўмовы. Перад кожным чалавекам працы яна адкрыла шырокія дарогі ў свет, дала яму поўныя магчымасці для выяўлення і развіцця ўсіх яго здольнасцей. Яна разняволіла працу чалавека, зняла з яго катаржныя путы бесчалавечнай эксплуатацыі, зрабіла працу высакародным абавязкам чалавека, спалучыла яе з радасцю творчасці, радасцю і шчасцем стварэння новага свету, новага жыцця. Для змен, якія адбыліся ўжо ў першыя гады пасля рэвалюцыі, вельмі характэрны быў масавы рух за авалоданне ўсімі багаццямі чалавечай культуры. На Беларусі ўпершыню за ўсю гісторыю яе існавання адкрываюцца ў тыя гады універсітэт і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, ствараюцца тэатры, кніжныя выдавецтвы, будуюцца шматлікія школы, клубы, бібліятэкі, узнікае масавы літаратурны рух.

Калі да рэвалюцыі ў Беларусі былі лічаныя адзінкі пісьменнікаў, дык у дваццатых гадах з'явілася некалькі літаратурных аб'яднанняў і самае масавае з іх — «Маладняк». Да тых год адносіцца пачатак дзейнасці большасці нашых сучасных пісьменнікаў старэйшага пакалення. Сярод іх не апошняе месца займае Іларыён Мацвеевіч Барашка. Быў ён у свой час тыповым маладнякоўцам, які спалучаў літаратурную працу з працаю газетчыка, рэдактара, арганізатара масавіка і з безліччу іншых абавязкаў і нагрузак. Камсамолец з 1924 года і камуніст з 1931, ён прымаў самы актыўны ўдзел у культурным будаўніцтве рэспублікі, у яе літаратурным жыцці. Старэйшы член «Маладняка», ён уваходзіў у склад першай рэдакцыі часопіса «Полымя», некаторы час з'яўляўся рэдактарам часопіса сялянскай моладзі «Малады араты», намеснікам рэдактара камсамольскай газеты «Чырвоная змена». Працаваў ён і членам рэдкалегій часопіса «Маладняк» і часопіса «Беларусь калгасная».

Ва ўсіх гэтых выданнях друкаваліся і яго творы — апавяданні, нарысы, аповесці, фельетоны, рэцэнзіі. Ён пісаў пра першыя дні рэвалюцыі, пра героіку грамадзянскай вайны, партызанскі рух, сацыялістычныя ператварэнні ў краіне. Першы зборнік яго твораў пад характэрнай назвай «У прасторы» быў выдадзены «Маладняком» у 1926 годзе. Пасля гэтага былі апублікаваны аповесць «Рыгор Галота», зборнікі апавяданняў «На розныя тэмы», «Камунары» і інш. Апошні зборнік «Блізкія далі» быў выдадзены ў 1959 годзе.

Спрабаваў свае сілы І. Барашка і ў кінематаграфіі. Па яго сцэнарыі ў 1937 годзе быў пастаўлены мастацкі гісторыка-рэвалюцыйны фільм «Дняпро ў агні». За апошнія гады былі пастаўлены па яго сцэнарыях навукова-папулярныя фільмы «Індыйская паэма В. В. Верашчагіна», «У свеце кніг» (да чатырохсотгоддзя рускага кнігадрукавання), «Георгій Скарына», «Працаўнікі лесу».

Пяру Іларыёна Барашкі належаць некалькі п'ес, лібрэта оперы і п'еса-казка для лялечных тэатраў.

Выступаў пісьменнік і як даследчык-гісторык, апублікаваўшы ў свой час некалькі прац аб падзеях 1905 года на Беларусі, некалькі доследаў па хроніцы рэвалюцыйных падзей 1905 і 1917 гадоў і некаторыя іншыя.

Каштоўны ўклад у культурнае жыццё ўнёс юбіляр як папулярызатар беларускай мастацкай літаратуры за межамі рэспублікі. Вядомы яго пераклады на рускую мову асобных твораў Кандрата Крапівы, Кузьмы Чорнага, Платона Галавача, Алеся Кучара і Аркадзя Маўзона.

Некалькі год Іларыён Барашка працаваў на кінастудыі Белдзяржкіно ў часе яе знаходжання ў Ленінградзе. У 1939 годзе ён скончыў сцэнарны факультэт кінаакадэміі ў Маскве, пасля чаго працаваў спачатку ў Камітэце па справах кінематаграфіі пры Савеце Міністраў СССР, потым у Камітэце па справах мастацтва, пасля дырэктарам Музея ўсходняга мастацтва, дырэктарам Музея выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна і ўрэшце ў Міністэрстве культуры СССР.

У часе Вялікай Айчыннай вайны І. Барашка служыў у Палітупраўленні Ціхаакіянскага ваенна-марскога флоту, а затым у Палітупраўленні Чарнаморскага флоту, рэдагаваў часопіс «У дапамогу чырвонафлоцкай самадзейнасці».

Цяпер наш юбіляр — пенсіянер.

Такі жыццёвы і творчы шлях Іларыёна Мацвеевіча Барашкі, якога некалі ў «Маладняку» мы называлі проста Іларыем. Дзе б ні працаваў ён, якія б пасады ні займаў, ён заўсёды ставіўся да сваіх абавязкаў, да сваёй творчасці і грамадскай дзейнасці як сумленны чалавек, як камуніст.

Такім мы ведаем яго, ведаем як пісьменніка, журналіста, грамадскага дзеяча, урэшце як добрага таварыша, сціплага чалавека. Усё, што зрабіў ён за сваё жыццё, з'яўляецца добрым укладам у культурнае будаўніцтва нашай рэспублікі, у літаратуру нашага народа, жыццём і кроўнымі інтарэсамі якога заўсёды жыў, жыве і будзе жыць наш юбіляр.

Пажадаем жа яму ад усёй глыбіні сэрца доўгіх год жыцця і новых поспехаў, новых удач у яго творчасці і ў асабістым жыцці.

У Токіо ў перакладзе на японскую мову выйшла беларуская кніга «Ніколі не забудзем». Вы бачыце супервокладку гэтага выдання.

ГАРКОТА БЯРОЗАВАГА СОКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЗААПАРКУ ПАТРЭБЁН... ЗАЯЦ

Напоўнены свістам, святлом, пахамі — веснавы лес. Напалоханы трэскам матацыкла, няўклюдна махаючы крыламі, дарогу пералятае ўдод. Чырвоны сасновы бор абступае дарогу. Гэта «перастой» — стары лес, які падлягае высечцы. На кожнай сасне глыбокі надрэз і пад ім — бляшаны латок для сцёку «жывіцы». З жывіцы робяць каштоўныя маслы і лякарствы. Такая сасна гіне не адразу, праз некалькі гадоў. З кожным годам яна робіцца сушэйшая і званчэйшая, і ў лёсе яе ёсць нешта велічнае, самаахвярнае.

Над намі неба — колеру недаспелага арэха, і на яго фоне — гняздо бусла на бярозе...

— Разумная птушка — бусел,— паварочваецца да мяне інспектар па ахове Козыраў. — Калі лета засушлівае, ён «лішняе» яйцо з гнязда выкіне. Затое астатнія бусляняты выжывуць...

Ён некаторы час маўчыць, заняты сваімі думкамі, потым працягвае:

— Вось знішчылі ў Аўстрыі воўка — касуль стала менш. Узяліся за ястраба — пачала знікаць курапатка. У Англіі шчупака вывелі, думалі — рыбы будзе больш. Ну і што ж? Плотка пачала гінуць.

— Чаму ж пачала гінуць плотка? Даруйце, але я не бачу тут сувязі.

— Таму што ў яе пачаў знікаць інстынкт самазахавання. Інстынкт барацьбы. Барацьба за самазахаванне ў жывёльным свеце — гэта стымул развіцця... Галаву! — раптам закрычаў ён мне.

Я ледзь паспеў нахіліцца. Над галавою мільгануў кароткі сталёвы дрот. Ен быў нацягнены паміж дзвюма сасонкамі. Інспектар вылез з машыны і, лаючыся, пачаў раскручваць дрот.

— На лася браканьеры паставілі, — растлумачыў ён. — Гэта ж калі звер наляціць на дрот на скаку, задушыцца...

— Да чаго я ўсё перад гэтым гаварыў, — працягваў ён, калі мы паехалі далей. — Нядаўна я прачытаў у адным часопісе такія словы: актыўней, маўляў, умешвайцеся ў законы прыроды! Заклік правільны, але трошкі няпоўны. Перш чым умешвацца ў законы прыроды, трэба іх добра вывучыць. А ў нас пра гэта іншы раз забываюцца. Вось і атрымліваецца: праводзім меліярацыю — гіне рака, апыляем палі хімікатамі — гіне звер, курапатка... Я не супраць хіміі, але хіба нельга рабіць гэта больш разумна, па-гаспадарску. А то атрымаецца, што хутка зайца ў заапарку будуць паказваць, як слана, — нявесела пажартаваў ён.

Пры ўсёй аднабаковасці была ў гэтым разважанні свая выпакутаваная праўда: занадта часта даводзілася бачыць інспектару, з якой лёгкасцю неразумнае ўмяшанне чалавека губіла тую вялікую і каштоўную справу, якую яны з такой цяжкасцю, як аленьчык на ветры, распальвалі ў сваім заказніку...

ГАЛОЎНЫЯ БРАКАНЬЕРЫ

Рыбінспектар Жукаў — непаголены, у заляпаным граззю плашчы, апухлы ад бессані (толькі што вярнуўся з камандзіроўкі — трое сутак не спаў, ганяўся за браканьерамі) — на маё пытанне аб рыбе пахмура адказаў:

— Буйная плотка загінула сёлета: не аднераставала — вада была вельмі халодная... А іншай рыбы не было і не будзе.

— Браканьераў шмат развялося?

— Пакуль усяго 122 чалавекі,— адказаў Жукаў. — Але браканьеры з сецямі — гэта нібы пячорныя людзі з дубінамі... Гэта сволач дробная, — у інспектара была схільнасць да мастацкіх параўнанняў. — Ёсць у нас браканьеры буйнейшыя, сучасныя...

— Хто гэта?

— Галоўны браканьер — гэта завод штучнага шоўку. Кожныя суткі скідае ў Дняпро тону сернай кіслаты, паўтоны серавугляроду і іншай атруты.

— Хіба завод не мае ачышчальнікаў?

— Пабудавалі неяк у трыццатых гадах, разлічылі на адну чаргу. А цяпер ужо чацвёртую заканчваюць, а ачышчальнікі ранейшыя. Ніхто не хоча гэтым займацца. Шкловуўская фабрыка «Спартак», напрыклад, дзяржава адпусціла 468 тысяч рублёў на ачышчальныя збудаванні. І што ж: фабрыка гэтыя сродкі не выкарыстала, яны спісаны. Скідванне бруднай вады ў вадаёмы склала летась 23 мільёны 600 тысяч кубаметраў! Якая тут яшчэ рыба выжывае!

Жукаў выняў з пісьмовага стала ёмісты стос паперы і патрос ім:

— Вось увесь сэнс нашай работы — складаем пратаколы на браканьераў. Пішам справаздачы, склікаем сходы... Але чаго мы дамагліся за гэтыя гады? Нічога! Якая карысць ад такой работы?

— Няўжо апроч пратаколаў вы больш ніякіх мер не прымаеце?

— Сёе-тое робім. Ёсць у нас грамадскія інспектары аховы прыроды на заводах. Вось, напрыклад, здарылася летась аварыя на заводзе — лопнула труба. Брудная вада пайшла ўся ў раку. Дохлая рыба плыла па Дняпры да Быхава. Агурковыя агароды, што ля ракі,— загінулі. А на заводзе ўсё шыта-крыта. Дакументацыя ў парадку — быццам ніякай аварыі не было. Але інспектары нас папярэдзілі... Ну, уляпілі мы штраф. Але хіба рыбу выратуеш штрафамі? Вывад такі: трэба забараніць скідванне брудных вод у раку, пабудаваць магутныя ачышчальнікі. У нас каня не з таго боку запрагаюць: спачатку будуюць завод, а потым — ачышчальнікі. А трэба наадварот! І каб месца, дзе завод будуюць, з намі ўзгаднялі...

— Значыць, уся справа ў заводах?

— Не толькі. Ёсць яшчэ прычыны. Рака гіне ад няправільнай меліярацыі і ад няправільнай высечкі лясоў. Або яшчэ пытанне аб вадасховішчах. Спачатку секлі лес, рабілі вадасховішча. Там былі і рыба і звер. Цяпер спускаюць вадасховішча — вырашылі апрацоўваць больш зямлі. Што ж атрымліваецца. Спусцілі нядаўна Косіцкае вадасховішча — 264 гектары. Рыбу і звера загубілі, пні гнілыя тырчаць на тым месцы, абсяг усё роўна не распрацоўваюць. А цяпер думаюць спусціць Цяцерынскае вадасховішча.

ЛЯ МЁРТВАЙ РАКІ

Радасць і гора заўсёды могуць здацца перабольшанымі, калі думаеш пра тыя месцы, дзе ты нарадзіўся, пра берагі, ля якіх прайшло тваё маленства. Але цяпер я не перабольшваю. Я бачыў мёртвую раку. Уявіце сабе вялізнае забалочанае поле з нявыкарчаванымі пнямі. Раней на гэтым месцы шумеў зялёны бор. Глыбокая траншэя, поўная гнілой вады, якая кішыць яшчаркамі, сцякае ў раку. Рака Лохва — голая, парослая травой, з астравамі абяскроўленага леташняга чароту. Нават вясною яна не разлілася... А некалі ж тут раслі вялізныя прыгожыя вольхі! Лес трымаў берагі, ён жывіў раку вадою (а ў нас часта думаюць наадварот), ачышчаў яе. Потым лес высеклі, берагі пачалі абвальвацца, глеем занесла шчупаковыя ямы, нерасцілішчы рыбы. Рыба даўно пайшла адсюль, і балота вось-вось паглыне гэтую пакінутую на волю лёсу раку. Пытанне аб малых рэках цяпер вельмі хвалюе паляўнічых і рыбаловаў. Бо яшчэ ў школе мы вучылі, што вялікая рака выцякае з малой. Малая рака пачынаецца з крыніцы. Тут б'ецца чыстае сэрца ракі! Нельга забруджваць яго. Калі не будзе рыбы ў малых рэках, дык яе не будзе і ў вялікіх — гэта рыбацкая ісціна. Няхай жа яна стане не толькі рыбацкай!..

...Памятаю, я выйшаў на шашу і сеў у спадарожную машыну. Дарога ляжала пустынная і светлая ад бяроз. Бярозы былі ў чырвоных пацёках ад соку. На іх вісеці вёдры. Перад самым горадам шафёр спыніў машыну. Мы знялі вядро. Яно было поўнае празрыстага соку. Цынк ярка адсвечваў унутры. Потым мы паехалі. У роце было свежа і горка ад бярозавага соку, і нават курыць не хацелася, каб даўжэй захаваць гэтае адчуванне.

Б. КАЗАНАЎ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

Магілёўская вобласць.

ЛЕКТОРЫЙ КУПАЛАЎСКАГА МУЗЕЯ

Каля тысячы вечароў, ранішнікаў, сустрэч-успамінаў і гутарак правёў за апошнія пяць гадоў лекторый Літаратурнага музея Янкі Купалы. Пра народнага паэта расказваюць пісьменнікі, дзеячы мастацтва, вучоныя, журналісты, настаўнікі, рабочыя, калгаснікі, хто асабіста ведаў Янку Купалу. Жывое слова ўспамінаў дапамагае чытачам-неведвальнікам музея ўявіць жывы вобраз песняра, глыбей зразумець яго творчасць.

Многія артысты, мастакі, кампазітары працавалі над пастаноўкай сцэнічных твораў Янкі Купалы, рабілі малюнкі да яго кніг, пісалі музыку на словы паэта.

Мы запрасілі ў Купалаўскі лекторый народнага артыста СССР П. Малчанава. Наведвальнікі музея і яго супрацоўнікі з цікавасцю слухалі ўспаміны вядомага артыста, якому ў трыццатых гадах давялося ставіць купалаўскія п'есы. У той час П. Малчанаў жыў у паэта на кватэры, часта гутарыў з аўтарам «Паўлінні» і «Прымакоў».

Выступаў у лекторыі і народны артыст СССР Б. Платонаў. На сустрэчу з ім прыйшлі кіраўнікі гуртоў мастацкай самадзейнасці беларускай сталіцы. Артыст расказаў ім, як ён працаваў над вобразам пана Быкоўскага ў спектаклі «Паўлінна».

Народны артыст СССР кампазітар Я. Цікоцкі на адным з вечароў-успамінаў расказаў, з якой павагай ставіўся Янка Купала да творчасці народа, як ён выкарыстоўваў яе ў сваіх вершах і паэмах. Кампазітар нагадаў, як у 30-я гады пяснярэ часта хадзіў па Траецкім базары (цяпер плошча Парыжскай камуны) і слухаў ігру народных музыкаў. Паэт любіў гутарыць з цымбалістамі, лірнікамі, скрыпачамі, гуслярамі, спевакамі.

Навуковыя супрацоўнікі нашага музея часта праводзяць літаратурныя вечары і ранішнікі на прадпрыемствах, ва ўстановах, у калгасах і саўгасах рэспублікі.

Вечары на тэму «Янка Купала і беларуская музыка» адбыліся ў рабочых клубах Мінскіх аўтамабільнага і трактарнага заводаў. Для іх праведзення быў распрацаваны спецыяльны сцэнарый. Выступленні ўдзельнікаў вечара чаргаваліся з выкананнем музыкі на словы народнага паэта. Гэтыя вечары правялі паэт П. Глебка, народны артыст СССР Р. Шырма і народны артыст БССР Г. Цітовіч.

Тэматычныя вечары «Янка Купала ў выяўленчым мастацтве» адбыліся ў клубе мінскіх будаўнікоў трэста № 1.

Гэтай жа тэме была прысвечана перадача па тэлебачанні. Выступалі мастакі, якія добра, ведалі Янку Купалу, — А. Волкаў, З. Паўлоўскі, П. Сергіевіч, Я. Ціхановіч, С. Андруховіч і інш.

У парку імя Горкага, у клубе мінскіх аўтамабілебудаўнікоў і ў лекторыі Літаратурнага музея цікава прайшлі ранішнікі «Творчасць Я. Купалы перыяду Вялікай Айчыннай вайны», «Народны песняр і дзеці». Пасля гэтых мерапрыемстваў многія піянерскія атрады прыходзяць у Літаратурны музей і тут праводзяць свае зборы, а юныя краязнаўцы ідуць у паходы па купалаўскіх мясцінах — у Вязынну, на Барысаўшчыну, у Любаншчыну, Лагойшчыну, дзе сустракаюцца з людзьмі, якія ведалі паэта, выступаюць з канцэртамі мастацкай самадзейнасці. У рэпертуары дзяцей — творы Я. Купалы.

На Любаншчыне ў калгасе імя БВА наш лекторый правёў вечар, прысвечаны гісторыі напісання Я. Купалам паэмы «Над ранаю Арэсай». Выступалі былыя камунары, якія асабіста ведалі паэта і сталі героямі яго твора.

Цікавыя тэматычныя вечары адбыліся і на Барысаўшчыне, дзе не раз бываў Я. Купала. У гэтых вечарах актыўны ўдзел прымаў настаўнік Я. Замерфельд.

Штогод лекторый музея праводзіць свята вясны на радзіме паэта — у Вязынцы і Радашковічах.

У Купалаўскім лекторыі выступалі Я. Брыль, М. Лужанін, І. Грамовіч, П. Прыходзька, С. Грахоўскі, А. Вялюгін, Э. Агняцвет, Р. Няхай, Т. Масэнка, А. Юшчанка і многія іншыя беларускія і украінскія пісьменнікі.

Літаратурны лекторый музея дапамагае глыбей вывучаць жыццё і творчасць выдатнага беларускага песняра.

Алесь ЕСАКОЎ,
вучоны сакратар Літаратурнага музея Я. Купалы.

З нашай пошты

ЧЫТАЧ БУДЗЕ ЎДЗЯЧНЫ

Аматараў і прыхільнікаў паэзіі цяпер можна сустрэць усюды. Аднойчы мне давялося гутарыць з маладым аператарам Полацкага нафтаперапрацоўчага завода.

— Я горача люблю беларускую паэзію, многія творы ведаю напамяць. Але хіба ўсё ў нас можна дастаць у бібліятэцы? А мне б хацелася, каб кожны ведаў радкі Пімена Панчанкі: «Даруй, Радзіма, ды ў сваім жыцці сябе тваёй галінкай адчуваю, якой на іншай глебе не расці».— Малады рабочы крыху памаўчаў і дадаў:— Было б добра, калі б у нас выдаваліся невялічкія кніжкі выбраных вершаў, разлічаныя на шырокага чытача.

Сапраўды, добра было б зрабіць гэта, узяўшы за прыклад выдаваемую маскоўскім выдавецтвам «Молодая гвардия» серыю кніжак «Бібліятэчка выбранай лірыкі». Чаму б нашаму выдавецтву «Беларусь» не пераняць гэтую добрую справу? Кніжкі з серыі «Беларускай выбранай лірыкі» (назавём яе так) маглі б выходзіць у мяккай вокладцы, коштам па чатыры — шэсць капеек. У кожнай з іх — па 20—30 лепшых вершаў паэта. Тыражы такіх зборнічкаў маглі б дасягнуць 30—50 тысяч экземпляраў, каб іх мог набыць кожны жадаючы.

Б. ФРЭЙДКІН,
настаўнік.

г. Полацк.

Літаратура

АРПРЭС ДЛЯ ЛІМА

ПРАЗ ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ

ПІСЬМО З БЕРАГОЎ ОДРЫ

«Аўдыторыя Леапольда ва Уроцлаўскім універсітэце, з яе мудрагелістымі скляпеннямі, са шматкаляровай скульптурай — узор позняга барока ў архітэктуры. Калі 10 мая 1945 года ў залу ўнерыню ўвайшоў будучы рэктар універсітэта і політэхнічнага інстытута... падлога была завалена ваенным абмундіраваннем і зброяй... Праз некалькі дзён да рэктарскага стала падышоў адзін з нашых усюдысных пісьменнікаў і турыстаў. На пюпітры ён убачыў пакінутыя кнігі — як пагроза ці перасцярога — вядомыя «Прамовы да германскай нацыі» Фіхтэ, якія ў гэтай зале былі заклікам у пустаце. Новы раздзел адкрыўся ў культуры Уроцлава 10 мая 1945 года. Трэба было як мага хутчэй вынесці з аўдыторыі статую Фрыдрыха Вільгельма і загарнуць кнігу Фіхтэ, прыцярушаную пылам асады. Новы раздзел у культуры Уроцлава належаў Польшчы».

Так праз тры гады пасля вяртання Уроцлава ў межы польскай дзяржавы пісаў прафесар Тадэвуш Мікульскі, выдатны гісторык літаратуры, чалавек, улюбёны ў польскія традыцыі гэтага горада, на працягу шасці стагдзяў адрэзанага ад роднай зямлі кардонамі замежнага ўладарання, але нязменна блізкага народу.

...Калі сёння пейзаж Уроцлава яшчэ носіць на сабе сляды мінулай вайны, дык нішто ўжо не нагадвае пра яе ні ў разумовым і мастацкім жыцці горада, ні ў галіне прамысловасці і тэхнікі. Праўда, у выніку жахлівых ваенных разбурэнняў Уроцлаў не дасягнуў яшчэ даваеннай колькасці насельніцтва, аднак яго ранг як цэнтра мастацтва і навукі, а таксама цэнтра сучаснай прамысловасці (аўтаматыка і электроніка) сёння непамерна вышэйшы, чым калі-небудзь у перыяд германскага панавання.

Асабліва значным дасягненнем з'яўляецца стварэнне і развіццё ва Уроцлаве магутнай навукова-даследчай і выкладчыцкай базы. Яна ўзнікла, па сутнасці, на пустым месцы.

Разам з першымі прадстаўнікамі грамадзянскіх улад ва Уроцлаў прыбыў авангард так званай Культурна-навуковай групы, якою кіраваў прафесар Станіслаў Кульчынскі, былы рэктар універсітэта Яна Казіміра ў Львове, будучы рэктар Уроцлаўскага універсітэта і політэхнічнага інстытута. 24 жніўня быў выдадзены ўрадавы дэкрэт аб заснаванні ва Уроцлаве польскіх вышэйшых навучальных устаноў, а 15 лістапада пачаліся лекцыі для студэнтаў. Асноўныя навуковыя кадры складалі прафесары, якія рэпатрыяваліся з Львова. Акрамя таго, Львоў даў Уроцлаву Нацыянальны інстытут імя Асалінскіх («Асалінэум») — адну са старэйшых устаноў польскай навукі і культуры, створаную каля 150 гадоў назад, яго багацейшую бібліятэку і выдавецтва.

За 20 гадоў, якія мінулі з дня вызвалення, ва Уроцлаве вырасла шматлікае маладое пакаленне вучоных, свае прафесары і нават рэктары. У галіне вышэйшай асветы Уроцлаў з яго васьмю вну і 22 тысячамі студэнтаў заняў трэцяе месца ў краіне пасля Варшавы і Кракава. Звыш 400 прафесараў і дацэнтаў, тры тысячы старэйшых і малодшых навуковых супрацоўнікаў, гэта значыць больш, чым да вайны было ва Уроцлаве студэнтаў, налічваецца сёння ў яго вну і інстытутах, а таксама ў інстытутах Польскай Акадэміі навук і філіялах галіновых навукова-даследчых інстытутаў, якія дзейнічаюць тут.

Уроцлаўскае мастацтва таксама, як і ўроцлаўская навука, практычна стваралася на пустым месцы; яно не магло абаперціся на даваенныя традыцыі, як, напрыклад, кракаўскае, варшаўскае або познанскае. Новы прыток сіл і энергіі яно адчула пасля 1956 года, што было абумоўлена як агульнаю зменаю атмасферы ў краіне, дэцэнтралізацыяй грамадскага і культурнага жыцця, так і паскарэннем тэмпаў аднаўлення горада. Адначасова, адбілася і ўздзеянне новага дынамічнага фактара, якім стала шматлікае маладое пакаленне, што паставіла перад сабою смелыя задачы.

Цяжка, зразумела, даць тут належную ацэнку ўсім галінам мастацкай творчасці, аднак жа, на наш погляд, на першыя месцы маюць права прэтэндаваць перш за ўсё выяўленчае мастацтва і тэатр...

Гаворачы пра выяўленчае мастацтва, нельга не пачаць з Уроцлаўскай акадэміі мастацтваў, якая выхавала ў сваіх сценах цэлую плеяду маладых жывапісцаў, графікаў і скульптараў, якія ўсё часцей выстаўляюцца не толькі ў розных гарадах Польшчы, але і на зарубежных выстаўках. Эугеніуш Гоперт і Ханна Кшатуская, Станіслаў і Марыя Даўскія, Станіслаў Пянкальскі, а ў апошнія гады свайго жыцця таксама праслаўлены Ксаверы Дунікоўскі выхавалі мастакоў, якія выяўляюць неаспрэчны талент, такіх, як Юзаф Халас, Альфанс Мазуркевіч, Кшаслава Малішэўская, Малгажата Грабоўская і Ежы Борань (называем толькі найбольш вядомых).

Асаблівых поспехаў урацлавяне дабіваюцца ў галіне мастацкай кераміки (напрыклад, Мячыслаў Здановіч — лаўрэат міжнароднай выстаўкі ў Мілане, а таксама — разам з групай мастакоў — міжнароднай выстаўкі ў Празе). Кераміка і мастацкае шкло лічыцца ў Польшчы спецыяльнасцю Уроцлаўскай акадэміі мастацтваў, ледзь што не яе манаполіяй. Гэта і нарадзіла новую задуму — арганізаваць ва Уроцлаве міжнародныя трохгадовыя выстаўкі прыкладнога мастацтва, дзе дэманстраваліся б творы мастацтва і прамысловыя вырабы, выкананыя па праектах мастакоў. Ініцыятары ўроцлаўскіх выставак імкнуцца ператварыць іх у агляд творчасці мастакоў раду дружалюбных краін. Уроцлаўскі народны савет улічыў гэтую задуму ў сваіх гарадабудаўнічых планах. У новым цэнтры горада, які пачне ствараца ўжо ў бліжэйшы час, адведзена месца ансамблю выставачных павільёнаў.

Уроцлаўская «Пантаміма», лаўрэатка парыжскага «Тэатра Нацый» і Маскоўскага фестывалю моладзі, удзельніца міжнароднага фестывалю ў Заходнім Берліне, з'яўляецца нібы візітнай карткай тэатральнага мастацтва горада. Маладая трупа, створаная некалькі гадоў назад Генрыкам Тамашэўскім, выступала амаль ва ўсіх краінах нашага кантынента, гастраліравала ў ЗША, Канадзе і Ізраілі. Аднак пачатак тэатральнаму жыццю Уроцлава паклалі драматычныя тэатры. У першыя пасляваенныя гады ў тэатрах горада іграли многія акцёры з яркай творчай індывідуальнасцю, тут працавалі выдатныя рэжысёры, у тым ліку Эдвард і Марыя Вярцінскія, Генрых Шлятынскі, Вілям Хажыца, Якуб Ратбаум. У апошні час кіраўніцтва дзяржаўнымі драматычнымі тэатрамі Уроцлава ўзялі на сябе Крысціна Скушанка і Ежы Красоўскі, якія заснавалі калісьці славуты тэатр «Людовы» ў Новай Гуце пад Кракавам. У горадзе працуе таксама лялечны тэатр «Хохлік», які атрымлівае перамогі на Усяпольскіх фестывалях лялечных тэатраў.

Высокі ранг уроцлаўскіх тэатраў падкрэсліваюць арганізоўваемыя з году ў год Уроцлаўскія тэатральныя фестывалі, у якіх спачатку ўдзельнічалі толькі тэатры некалькіх гарадоў Заходняй Польшчы, а цяпер — лепшыя тэатры ўсёй краіны, у тым ліку Варшавы, Кракава і Лодзі. Гэтыя фестывалі набылі сёння характар усяпольскіх аглядаў сучаснага айчыннага рэпертуару. Вялікія спадзяванні выклікае паспяховае развіццё студэнцкіх тэатраў. Уроцлаўскі «Каламбур» лічыцца адным з самых цікавых і сталых студэнцкіх калектываў у краіне. Ён неаднаразова прадстаўляў польскую студэнцкую самадзейнасць на міжнародных студэнцкіх сустрэчах за рубяжом. Пажынаў лаўры за граніцаю і студэнцкі тэатр пантамімы «Гест» — малодшы партнёр «Пантамімы» Тамашэўскага. Успомнім, нарэшце, пра навейшае дасягненне тэатральнага Уроцлава — тэатр-лабараторыю «13 радоў», у пачатку гэтага года пераведзены сюды з Опаля.

Істотнае значэнне для развіцця мастацкага жыцця Уроцлава мае мясцовая кінастудыя, заснаваная 12 гадоў назад. Уроцлаўскія артысты неаднаразова здымаліся ў вядомых і ўзнагароджаных фільмах, выпушчаных ва Уроцлаве. З самага пачатку там працуе Станіслаў Ленартовіч («Зімовы прыцемак», «Італьянец у Варшаве»), там зняў большасць сваіх фільмаў Войцах Хас («Як быць каханай», «Рукапіс, знойдзены ў Сарагосе»), а таксама Казімеж Кутц («Крыж адважных», «Людзі з цягніка»). На працягу некалькіх гадоў з Уроцлавам быў звязаны і Анджэй Вайда, чый праслаўлены «Попел і алмаз» узнік іменна на мясцовай студыі.

У першыя пасляваенныя гады ўроцлаўскія літаратары іграли першую скрыпку ва ўсім духоўным жыцці горада. Пасля большасць выдатных пісьменнікаў пераехала ў Варшаву і літаратурнае жыццё ў горадзе замерла. За апошні час наглядаецца яго адраджэнне. Уроцлаўская група пісьменнікаў, якая заваёўвае новыя пазіцыі ў літаратуры краіны, вызначаецца вялікай актыўнасцю, выступае як ініцыятар усяпольскіх пачынанняў. У прыватнасці, іменна па пачыну ўроцлаўскіх літаратараў адбылася дыскусія на тэму «Літаратура і фільм», а таксама сесія, прысвечаная польскай драматургіі пасляваеннага дваццацігоддзя.

Каб даполніць панараму культуры сучаснага Уроцлава, скажам яшчэ некалькі слоў пра музычнае жыццё горада, якое канцэнтруецца вакол філармоніі і опернага тэатра. У гэтай галіне Вышэйшая музычная школа адыграла такую ж ролю, як у выяўленчым мастацтве Акадэмія мастацтваў. У пасляваенным летапісе музычнага жыцця Уроцлава запісаны такія імёны, як Казімеж Вілкамірскі, Станіслаў Скравачэўскі, а затым Адам Капыцінскі, Эдмунд Кайдаш. Ажыўленню музычнага жыцця горада садзейнічаюць праводзімыя ўжо некалькі гадоў штогадовыя кампазітарскія фестывалі. Задуманыя як агляды творчасці кампазітараў Заходняй Польшчы, яны набываюць усё больш шырокі, усяпольскі размах.

Цяжка дапісваць да гэтага, па неабходнасці беглага агляду дваццацігадовага развіцця разумовага і мастацкага жыцця Уроцлава нейкую абагульняючую канцоўку. Бадай, як найбольш істотны трэба ў заключэнне адначыць факт пастаяннага росту яго культурнага значэння — вынік усё больш смелых творчых імкненняў урацлавян.

Ігнацы РУТКЕВІЧ,
польскі публіцыст.

«КІЕЎ 16 С-3»

НОВАЯ АМАТАРСКАЯ КІНАКАМЕРА

Шырокае распаўсюджванне аматарскіх кінакамер фармату 2 на 8 міліметраў тлумачыцца іх прастатой, эканоміяй плёнкі і магчымасцю апрацоўваць адначасова вялікую колькасць яе. Аднак у гэтых камер ёсць і недахопы. Маленькі фармат не дапускае вялікага павелічэння пры праекцыі, і фільм могуць глядзець толькі невялікія аўдыторыі. Апроч таго стандартная частата здымкі — 16 кадраў у секунду — выключае магчымасць паказу фільмаў на тэлебачанні, таму што пры тэлепраекцыі кадры мяняюцца 25 разоў у секунду.

Іншыя кінаматары застаюцца верныя фармату 16 міліметраў, які досыць універсальны і дазваляе дэманстраваць фільм на «нармальным» экране. Такія камеры незаменныя для стварэння любых тэлевізійных і вучэбных праграм, арганізацыі пазнавальных тэлеперадач і нават здымкі мастацкіх фільмаў.

У Савецкім Саюзе пачаты серыйны выпуск шаснаццаціміліметровай камеры «Кіеў 16 С-3» — мадэрнізаванага варыянта мадэлі «Кіеў 16 С-2». Вонкава камеры падобныя, але канструктары зрабілі рад удасканаленняў, якія спрасцілі работу з апаратам і павялічылі яго надзейнасць. У камеры ўжыты новы грэйферны механізм, які выключае неабходнасць ужывання контргрэйфера ў касеце. Палепшаны фільмавы канал, што палягчае зарадку плёнкі. У ранейшай мадэлі гэта было самае «слабае месца» і справядліва выклікала нараканні.

У касеце ўстаноўлены транспартуючы зубчаты барабан. Гэта невялікае ўдасканаленне значна пашырыла магчымасці апаратуры і дазволіла ўжываць плёнку з двухбаковай перфарацыяй для «нямых» фільмаў і з аднабаковай — для гукавых.

Аб'ектываў два — нармальны з фокуснай адлегласцю 25 міліметраў і тэлескапічны — пяцідзесяціміліметровы. Абодва яны размешчаны на паваротнай турэлі. Камера камплектуецца пісталетнай ручкай.

Галіна МІЛЕЎСКАЯ.
(АДН).



АРМАТУРШЧЫКІ.

Фотаэцюд В. ДУБІНКІ. (Слуцк).

ГРАФІКІ СУСТРАКАЮЦЦА Ў ЛЮБЛЯНЕ

...Уважлівы позірк, іранічная складка ў куточках губ, валявы выразны твар. Перад намі — графічны партрэт Жоліо-Кюры работы Пабло Пікасо. На першы погляд можа здацца, што мастак стварыў гэты твор наспех: штрыхі здаюцца нядбайнымі, незакончанымі. Але чым больш вы ўглядаецеся ў партрэт, тым больш захапляюць вас прывабнасць і сіла таленту Пікасо. Перад вамі — жывы Кюры, вялікі вучоны, палымяны барацьбіт за мір — такі, якім яго ведалі, якім яго памятаюць многія тысячы людзей...

— Партрэт работы Пікасо — толькі адзін з тысячы з лішнім твораў, што дэманструюцца ў гэтыя дні ў Любляне на адкрытай нядаўна традыцыйнай міжнароднай выстаўцы графікі, — расказвае навуковая супрацоўніца Люблянскай сучаснай галерэі Лерка Менашэ.— Трэба сказаць, што Любляна па праву лічыцца ў югаслаўскіх мастакоў «сталіцаю графікі». Тут працуюць піянеры югаслаўскага графічнага мастацтва — Якац Божыдар, таленавіты мастак і баявы партызан, першы рэктар заснаванай пасля вайны Славенскай акадэміі мастацтваў, Францэ Міхеліч, таксама актыўны ўдзельнік народна-вызваленчай барацьбы з фашызмам, прафесар Рыко Дзебаньяк і многія іншыя... Імёны гэтых і іншых югаслаўскіх графікаў шырока вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Гэта ў многім садзейнічала таму, што Любляна ў пасляваенны перыяд пачала ператварацца ў міжнародны цэнтр графікі. Вось ужо на працягу некалькіх гадоў кожныя два гады ў сталіцы Славеніі адкрываюцца вялікія міжнародныя выстаўкі графікаў. Сёлетняя выстаўка — шостая па ліку, у ёй прымаюць удзел мастакі з 42 краін свету, у тым ліку Савецкага Саюза, ЗША, Англіі, Францыі, Японіі, Аўстрыі, Польшчы, ГДР, Румыніі...

Разам з Л. Менашэ мы абышлі прасторныя і светлыя залы Сучаснай галерэі. На выстаўцы экспануецца нямала сапраўды таленавітых і маёмкіх твораў. У іх ліку — карціна балгарскага графіка А. Нейкава «Верасень, 1923». Тры чорныя шыбеніцы на чорным узгорку, тры чалавечыя фігуры вісяць на фоне панурага свінцовага неба — так паказаў мастак расправу рэакцыі са змагарамі за справядлівую справу, удзельнікамі ўзначаленага камуністычнай партыяй антыфашысцкага паўстання. Сярод твораў, якія прыцягваюць увагу, выкананыя з вялікім настроем сельскія пейзажы шведскага мастака Г. Нільсена. У ліку цікавых работ, несумненна, і творы савецкіх майстроў — выдатна зроблены «паляўнічыя» гравюры Е. Сідоркіна, «Зіма» К. Калінічавай, «Акрабаты» А. Кудрашова.

Але не ўсё на выстаўцы па-сапраўднаму цікавае. Многія заходнія мастакі, якія захапляюцца «навейшымі» плынямі ў жывапісе, прывезлі ў Любляну свае мадэрнісцкія творы. Бессэнсоўныя лініі, прведзеныя на палатне Э. Хаўзерам (ФРГ), рознакаляровыя плямы работы П. В. Дагліша (Канада), геаметрычныя практыкаванні Р. Гановера (ЗША) — гэтыя і іншыя падобныя да іх творы выклікаюць у гледача толькі цяжкае пачуццё недаўмення. Характэрна, аднак, што ля мадэрнісцкіх карцін амаль няма гледачоў. Я быў сведкам такой сцэнкі. Юнак і дзяўчына спыніліся ля палатна, на якім намаляваны каляровыя шары і кубікі.

— Што гэта? Малюнак новых шпалераў? — спыталася дзяўчына.

— Хто яго ведае! — паціснуў плячыма яе спадарожнік.— Давай паглядзім што-небудзь больш зразумелае...

Яны прайшлі ў другую залу і надоўга спыніліся ля партрэта Жоліо-Кюры работы Пікасо.

Ю. КАРНІЛАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Любляна—Бялград.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Паважаны рэдактар!

Дазвольце праз Вашу газету выказаць сардэчную падзяку ўсім арганізацыям, сябрам і таварышам, якія падзялілі наш глыбокі смутак з выпадку смерці Канстанціна Мікалаевіча Саннікава.

Сям'я САННІКАВЫХ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

23 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — «Жонка для аўстралійца». Мастацкі фільм. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — «Высокая горка». Мультыплікацыйны фільм (М). 17.20 — Усесаюзная спартакіяда школьнікаў (трансляцыя на Маскву). 17.30 — «Нам дружбу бацькі завяшчалі». Сустрэча дзяцей французскіх лётчыкаў з эскадрыллі «Нармандыя — Нёман» з савецкімі лётчыкамі гэтай эскадрыллі. 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Подзвіг ля вёскі Лавы». Пра Героя Савецкага Саюза В. Г. Драздовіча і яго баявых таварышаў. 18.55 — канцэрт па заяўках магілёўскіх машынабудаўнікоў. 19.35 — міфы і рэчаіснасць Амерыкі. «Падарожжа па Нью-Йорку». Тэлевізійны нарыс. 20.00 — спартыўная перадача. 20.45 — «Аголеная са скрыпкай». Тэлевізійны спектакль.

Другая праграма. 17.30 — для школьнікаў. «Гном» (М). 18.30 — тэлевізійныя навіны (М). 18.50 — «Экран вялікай хіміі» (М). 19.30 — Д. Кюсак. «Гарачае лета ў Берліне». Спектакль Горкаўскага абласнога драматычнага тэатра імя М. Горкага. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М).

24 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — «Аголеная са скрыпкай». Тэлевізійны спектакль. 15.40 — праграма перадач. 15.45 — Усесаюзная спартакіяда школьнікаў (трансляцыя на Маскву). 16.15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Н. Клыкова. Г. Скараспелаў. «Асенняя казка». Спектакль Горкаўскага тэатра лялек (М). 17.10 — «Муравейка-хвалько». Мультыплікацыйны фільм. 17.30 — тэлевізійныя навіны. 17.55 — «Мелодыі над морам». Эстрадны канцэрт. 18.20 — міфы і рэчаіснасць Амерыкі. 1. Выступленне каментатара па знешнепалітычных пытаннях Г. Навіцкага. 2. «Што іх чакае наперадзе». Тэлевізійная навела. 19.00 — да Дня Ваенна-Марскога Флоту СССР. Перадача з горада-героя Севастопаля. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Палата». Мастацкі фільм.

Другая праграма. 17.10 — тэлевізійныя навіны (М). 17.30 — «Веды». Навукова-папулярная праграма (М). 18.30 — канцэрт мастацкай самадзейнасці. Перадача з Кішынёва. 19.00 — «Яго песні зберагае народ». Кінанарыс. 19.10 — да Дня Ваенна-Марскога Флоту СССР. «Ідзём у мора». «Так трымаць!» Дакументальныя фільмы. 20.00 — лепшыя фільмы савецкага кіно. «Адмірал Нахімаў».

25 ліпеня

Першая праграма. 9.25 — праграма перадач. 9.30 — Дзень Ваенна-Марскога Флоту СССР (М). 11.20 — Усесаюзная спартакіяда школьнікаў (трансляцыя на Маскву). 12.20 — «Працоўным рэзервам — 25 год». Да Усесаюзнага агляду калектываў мастацкай самадзейнасці працоўных рэзерваў (М). 15.45 — праграма перадач. 15.50 — тэлевізійныя навіны (М). 16.00 — наш кінаглобус. «Аку-Аку». Дакументальны фільм. 17.25 — маленькі канцэрт. 17.40 — сустракаюцца суседзі. «Дзесяць пытанняў аб Мінску». Заключная перадача віктарыны (трансляцыя на Прыбалтыку). 18.15 — канцэрт артыстаў Беларускага акадэмічнага тэатра оперы і балета. 18.40 — «Ці існуе вы, містэр Джонс?» Кароткаметражны мастацкі фільм. 19.05 — «Жаніцьба Бальзамінава». Мастацкі фільм. 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — «Кінаэкран — 1965» (М). 22.00 — канцэрт Асобнага ўзорнага аркестра Ваенна-Марскога Флоту (М).

Другая праграма. 16.00 — музычны кіёск (М). 16.25 — «Анно сатыры» (М). 16.35 — «Навіны дня». Кінічасопіс (М). 16.45 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 17.30 — «Святло і цені» (М). 18.00 — «Тэатр паэта і чытальніка» (М). 19.00 — «Інспектар і ноч». Мастацкі фільм (М). 20.30 — «Да новых сустрач, Муслім!» Фільм-канцэрт.

НОВЫЯ ЭКСПАНАТЫ МУЗЕЯ

З кожным годам папаўняюцца новымі экспанатамі фонды музея Ф. Э. Дзяржынскага. Музеі і архівы нашай краіны, Польскай Народнай Рэспублікі, прыватныя асобы прысылаюць сюды матэрыялы, якія ўсё паўней расказваюць пра жыццё і дзейнасць бясстрашнага рыцара рэвалюцыі.

Сёлета разам з фотакопіямі дакументаў аб рэвалюцыйнай дзейнасці Ф. Э. Дзяржынскага музей набыў рад арыгінальных экспанатаў. Найбольш каштоўныя сярод іх — стол і крэсла, якімі карысталіся Ф. Э. Дзяржынскі ў Вільнюсе. Мэблю гэтую музею перадаў А. Корж, які працуе ў будаўнічым упраўленні Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі. Ён у сваю чаргу атрымаў яе ў падарунак у 1945 годзе ад старэйшай сястры Ф. Э. Дзяржынскага Альдоны Эдмундаўны Дзяржынскай-Каяловіч, якая пераязджала з Вільнюса ў Польшчу. Альдона Эдмундаўна напісала даведку, у якой засведчыла, што «за гэтым арэхавым сталом разной работы, пакрытым чырвоным сукном, займаўся Фелікс Эдмундавіч, калі быў вучнем гімназіі ў гор. Вільна». Нядаўна ў сваім пісьме ў музей А. Дзяржынская-Каяловіч паведаміла іншыя падрабязнасці пра мэблю, якой карыстаўся Фелікс Эдмундавіч.

Жыхар Вільнюса А. Зубрынін падарыў музею бюст Ф. Э. Дзяржынскага, адліты на Урале з чыгуну больш 25 гадоў назад. Гэты бюст А. Зубрынін набыў у адным з магазінаў Адэсы.

Члены скульптурнага гуртка Маскоўскай школы-інтэрната № 95 зрабілі для музея барэльеф Ф. Э. Дзяржынскага ў гіпсе.

М. КАРНЕЕЎ.

г. п. Івянец.

Нашы госці

РАБОЧЫ ХОР «ЦЮРЫХ»

У Мінску выступіў швейцарскі рабочы хор «Цюрых».

Хор «Цюрых» своеасаблівы па складу і праграме. Акрамя харыстаў і харыстак у ім ёсць народная інструментальная капела, куды ўваходзяць два выканаўцы на кларнетах, гарманіст і кантрабасіст, а таксама тыральскі квартэт з двух мужчын і двух жанчын, выканаўцы на старажытным швейцарскім аргане, альпійскіх рогах, званах. У сувязі з тым, што жыхары розных кантонаў краіны гавораць на нямецкай, французскай, італьянскай і рэтараманскай мовах, уся праграма хору даецца ў чатырох варыянтах. Акрамя народных песень і мелодый, хор выконвае і творы швейцарскіх кампазітараў Э. Герцага, П. Вермана, Ж. Бавета, Н. фон Маоса, Э. Гролімунда, Х. Лейтхальда, на словы вядомага нацыянальнага паэта Готфрыда Келера і Ф. Буомбергера, О. Шмаліца, А. Бешчцала, І. Мата, І. Майнхарта.

У канцэрце, які адбыўся гэтымі днямі ў Мінскім Палацы культуры прафсаюзаў, хор «Цюрых» выканаў «Вячэрнюю песню», «Сакрэт ручайка», «У горад прыйшла вясна», «Анечка», «Званы на вежы Монаса». Добра паказалі Отці Базар і Гаётон Эрбета сцэнкі з жыцця шэйцарскіх пастухоў; цікава выконвае інструментальная капела народныя танцавальныя мелодыі.

З натхненнем выканалі нашы госці на рускай мове народныя песні і творы савецкіх кампазітараў: «Свяшчэннае мора», «Рабінушка», «Падмаскоўныя вечары», «Масква майская» і іншыя.

На здымку: швейцарскіх гасцей вітаюць прадстаўнікі грамадскасці Мінска.

Фота Ул. КРУКА.

ЦАЛІНА, ЯКУЮ ТРЭБА ЎЗНІМАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

служана лічыцца цяпер адным з лепшых у раёне. Былая наша курсантка М. Крот арганізавала ў калгасе «Шлях да камунізма» Брагінскага раёна хор і мастацкую агітбрыгаду. І такіх прыкладаў можна прывесці многа.

На курсы прымаецца без абмежаванняў моладзь, якая закончыла сярэднюю школу (вядома, тыя, хто мае добры музычны слых). Сёлета мяркуем залічыць на курсы сто чалавек.

Мы клапоцімся пра тое, каб вучэбная праграма курсаў памагала рыхтаваць добрых спецыялістаў сваёй справы. У групе баяністаў і кіраўнікоў аркестраў курсанты, акрамя спецыяльных дысцыплін, вывучаюць тэорыю музыкі, сальфеджыо, дырыжыраванне, музычную літаратуру. Гэта дае ім магчымасць не толькі навучыцца іграць на баяне, але і кіраваць хорам.

Такое ж «сумяшчэнне» прафесій прадугледжваюць праграмы ў групах харавікоў і танцораў, якія атрымліваюць і навыкі ігры на баяне. Танцораў вучаць не толькі выканаўчаму майстэрству, але і самастойна ставіць танцы; яны вывучаюць касцюмы народаў Савецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі, грым і акцёрскае майстэрства. Абавязковыя прадметы ва ўсіх групах — гісторыя КПСС, клубная справа, знаёмства з асновамі бібліятэказнаўства.

Не выхваляючыся, скажу, што выпускнікі нашых курсаў паспяхова здаюць экзамены на завочнае аддзяленне музвучылішча, іх ахвотна прымаюць туды.

Чалавек, які хоча ўдасканальваць свае веды, заўсёды знойдзе магчымасць вучыцца.

СТАРШЫНІ калгасаў часта звяртаюцца ў абласны Дом народнай творчасці з просьбай прысылаць баяністаў для калгасных клубаў. Нават і аплату да ста рублёў у месяц гарантуюць. Такая вялікая патрэба ў музыкантах невыпадковая. Колькасць клубаў няспынна расце, а баяністаў пакуль яшчэ рыхтуецца мала. Прычына гэтага становішча часткова ў тым, што тыя ж самыя кіраўнікі калгасаў, якія звяртаюцца з просьбамі да нас, не жадаюць пасылаць сваіх людзей на вучобу, другія ж лічаць, што ў іх калгасах няма здольных да музыкі людзей. І тыя і другія сыходзяцца ў адным: з вялікай аквотай наймаюць баяністаў з боку. Нават такі вядомы ў Гомельскім раёне прыгарадны калгас, як імя XXII з'езда КПСС, і той ужо неаднойчы запрашаў да сябе старонніх баяністаў, балетмайстраў, дырыжораў, хормайстраў. Але не ўсе гэтыя людзі аддаваліся справе з душой, папрацаваўшы крыху, некаторыя з іх пакідалі калгас, так і не наладзіўшы там адпаведнай работы.

Праўда, гэта не азначае, што мы павінны адмаўляцца ад дапамогі вопытных кіраўнікоў, кансультантаў. Тут гаворка ідзе пра тое, каб кожны калектыў меў свайго пастаяннага кіраўніка, які б па-сапраўднаму цікавіўся творчымі справамі самадзейных артыстаў і вырашэннем тых задач, што стаяць перад хлебаробамі.

Пра ўсё гэта мы не раз гаварылі дырэктару Яромінскага сельскага Дома культуры тав. Калачовай, але ў адказ заўсёды чулі: «Нашы калгаснікі не будуць слухаць абы-якога кіраўніка. Нам патрэбен спецыяліст вышэйшага класа». Няправільнасць такой пазіцыі відавочная. Калі прытрымлівацца думкі Калачовай, дык мы будзем і далей ствараць умовы для дзейнасці розднага роду «летуноў» ад мастацтва, для якіх не існуе родных, «сваіх» калектываў. На жаль, ёсць яшчэ ў нас такія «спецыялісты» і па музыцы, і па драме. Напрыклад, А. Аструн кіруе некалькімі харавымі калектывамі. Усе яны спяваюць адны і тыя ж песні. Гэта асабліва кінулася ў вочы, калі самадзейныя артысты выступалі на аглядзе народнай творчасці.

Каб падобныя факты не маглі паўтарацца, варта, як мне здаецца, пытанні, звязаныя з прызначэннем у калгасныя клубы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, вырашаць праз абласное ўпраўленне культуры.

І яшчэ некалькі заўваг, якія датычаць вырашэння праблемы нумар адзін. Кіраўнікі гаспадарак часта забываюцца пра брыгадныя клубы, чырвоныя куткі. Але ж і там патрэбен добры арганізатар адпачынку калгаснікаў.

Было б мэтазгодна арганізаваць падрыхтоўку баяністаў пры раённых дамах культуры і музычных школах. Гэта ў многім палегчыла б матэрыяльнае становішча навучэнцаў. Адзін час у Брагінскім раёне пры Доме культуры працавалі такія курсы і зарэкамендавалі сябе няблага. Патрэбна аднавіць іх работу не толькі ў Брагінскім, але і ў іншых раёнах.

Хацелася б паставіць на абмеркаванне і такое пытанне. Можа варта перавесці дзевяцімесячныя курсы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці на двухгадовы тэрмін навучання з трохмесячнай вытворчай практыкай у самадзейным калгасным калектыве? І прыраўняць зарплату іх выпускнікоў да зарплаты людзей з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй?

КІРАЎНІКІ калгасаў і саўгасаў маюць шырокія магчымасці для ўздыму культуры вёскі. Праблема кадраў культасветработнікаў стаіць сёння востра, але пры належнай зацікаўленасці яе можна вырашыць паспяхова. Закончыўшы кароткатэрміновыя курсы, выпускнікі іх маюць магчымасць вучыцца завочна ў музычным вучылішчы, інстытутах культуры, у завочным народным універсітэце мастацтва і г. д. Такім чынам, адначасова з культурным ростам жыхароў вёскі будзе расці і ўдасканальвацца ўзровень і веды кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, загадчыкаў клубаў і бібліятэк. Трэба толькі органам культуры быць больш настойлівымі і патрабавальнымі ў дачыненні да тых людзей, якія не вучацца, і чула ствараць умовы для тых, хто павышае свае веды.

Куток калекцыянера

«БЕРАЖЫЦЕ МІР!»

Такі надпіс зроблены на паштовай марцы, выпушчанай Міністэрствам сувязі СССР у гонар Сусветнага кангрэсу за мір, нацыянальную незалежнасць і ўсеагульнае раззбраенне ў Хельсінкі.

На марцы мастак Іосіф Левін намаляваў зямны шар, на фоне якога — рука, што трымае галінку міру. На гэтай галінцы на пяці мовах напісана слова «МІР». На другім плане малюнка ўнізе — контурнае адлюстраванне мірнага горада.

У калектываў мастацкай самадзейнасці Брэста стала добрай традыцыяй імяджаць у падшэфных калгасы з канцэртамі. У калгасе «Расія» Камянецкага раёна выступаюць брэсцкія чытачачкі.

Фота В. ГЕРМАНА.
БЕЛТА.

Літаратура і мастацтва 4

Пятніца, 23 ліпеня 1965 года

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. УЛІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63836. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 13900